# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 38 (2836) Год LV | Беласток, 19 верасня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)


# НАШ VII З'ЕЗД

Ілона КАРПЮК

**— Цяпер ужо пэўна не, але калісьці наш ліцэй называлі „манастыром", — кажа нясмела Пётр Божка, старшыня Арганізацыйнага камітэта VII З'езда выпускнікоў II Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім. — Дырэктар Карпюк, якога дарэчы вельмі паважаю, у свой час увёў дысцыпліну і строгі парадак, таму пасля заканчэння школы мне трэба было пару гадоў ад яе адпачыць, глянуць збоку, каб зразумець вартасць школьных гадоў ды вырашыцца з удзелам у з'ездзе выпускнікоў. Маладыя людзі наогул думаюць, што з'езды гэта сустрэча перш за ўсё старэйшых, а так няма, гэта сустрэча шматлікіх пакаленняў. Праўда, што найбольш старэйшых выпускнікоў, але таму, што яны наогул даўно не бачыліся і адчуваюць патрэбу сустрэчы. На практыцы ўсе пакаленні вельмі добра супольна гуляюць, без узроставых межаў. Атмасфера ў нас сямейная, а гэта самае галоўнае.**

Старшыня аргкамітэта Пётр Божка не наракае на колькасць работы, звязанай з падрыхтоўкай з'езда. Праца падзелена між аргкамітэт, дырэкцыю школы, настаўнікаў і вядзецца вельмі інтэнсіўна, бо з'езд ужо 24-26 верасня, а хочацца, каб быў запамінальны, каб удзельнікі былі задаволеныя і правялі час у цёплай, сяброўскай атмасферы. Пра папярэднія ды надыходзячы з'езд супольна з Пётрам Божкам распавядае „Ніве" дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк.

— У пачатку 1970-х гадоў, пасля трыццаці гадоў працы школы, выпускнікі самі захацелі сустрэцца, — кажа дырэктар. — Я тады быў у пачатковай школе і пэўна нават не думаў, што буду вучыцца ў ліцэі, а пасля працаваць настаўнікам. Галоўнае, што знайшліся людзі, якія захацелі працягваць першую ідэю. Тут, несумненна, важная роля аргкамітэта — групы людзей, якой хочацца арганізаваць з'езд.

Пётр Божка:

— Арганізацыйны камітэт гэта такая дапаможная рука, бо вядома, што ініцыятарам зараз выступае школа. Пару месяцаў да планаванага з'езда дырэктар тэлефануе да людзей, якія блізка школьных спраў, з прапановай арганізацыі сустрэчы. Збіраемся, у свабоднай атмасферы п'ем каву за кошт школы, ямо салодкае за кошт школы (*смех*) і плануем працу. Яшчэ ў 2005 годзе хтосьці запрапанаваў маю асобу на старшыню аргкамітэта, а я неяк не ўмеў адмовіцца. Так і было ў гэтым годзе. Гэта гонар, вядома, але ўсё ж такі найбольш працы на баку школы і дырэкцыі. Мая праца гэта падрыхтоўка сустрэч, парадкаванне працы, прадбачванне таго, што здарыцца, але пра гэта не варта гаварыць, бо ёсць цікавейшыя справы.

Дырэктар Сцепанюк сярод цікавейшых спраў пералічвае перш за ўсё добро выпускнікоў:

— Усё трэба добра перадумаць, каб час не марнаваўся. Трэба памятаць, што на з'ездзе паяўляюцца людзі, якія не бачыліся дзесяткі гадоў. Самае цікавае, што найбольш цягне тых, якія адсюль найдалей. Маем тэлефанаванні з-за мяжы, з Нью-Йорка, з Заходняй Еўропы. „Калі будзе з'езд?" — пытаюцца, бо заранёў ім трэба планаваць палёт і час тут, на месцы. Найцяжэй, вядома, з мясцовымі, бо яны рашаюцца ў апошні момант, таму да іх гарачая просьба: заяўляйце сваю прысутнасць раней, бо тады нам лягчэй займацца лагістыкай.

Сёлета ўжо другі раз з'езд будзе працягвацца тры дні. Гэта вынік паспяховай праграмы папярэдняга з'езда.

— Ужо пяць гадоў таму прыдумалі пачаць з'езд у пятніцу, — тлумачыць Пётр Божка, — вечарынай з грылем. Гэта нефармальная сустрэча на школьным панадворку, хаця ў рамках з'езда, але без гальштукаў ды касцюмаў. Частка ўдзельнікаў прыязджае ўжо ў пятніцу. Каб аблегчыць ім аднаўленне кантактаў, прапануем сустрэчу пры школе. Тады мы планавалі вечарыну на 70 чалавек, а з'явілася пад 200. Гэта было сапраўды спантаннае спатканне, без напружанасці, напышлівасці, хаця цэлы з'езд — вельмі сяброўскі і пазбаўлены непатрэбнай цырымоннасці. Вядома, ёсць афіцыйная частка, але гэта неабходны і вельмі эмацыянальны момант. Мушу сказаць, што пасля мінулаз'ездаўскай мастацкай часткі я быў у захапленні ад нашай моладзі. У ёй не толькі знакамітыя вынікі ў навуцы, але і незвычайная крэатыўнасць. Гэта вольная моладзь. Свабодны ў нас таксама мікрафон. У час з'езда ўзяць голас можа любы ўдзельнік, але ў яго абавязак раней заявіць аргкамітэту такую ахвоту.

— Галоўнай падзеяй з'езда будзе баль у суботу (25 верасня). Аднак гэты дзень пачнем з набажэнства ў царкве ў 9 гадзін, — працягвае Андрэй Сцепанюк. — Афіцыйная частка — у 11.30. Моладзь рыхтуе мастацкую частку. Стараемся, каб яна была вельмі душэўнай, эмацыянальнай, бо сюды прыязджаюць людзі, якія зараз з беларускасцю, з нашымі традыцыямі шмат супольнага не маюць і плачуць, проста плачуць тут. У суботу ўспамінаем тых, якія адышлі з жыцця. Афіцыйна тут у Бельску наведваем магілы настаўнікаў і выпускнікоў, у меншых групах паасобныя класы едуць за Бельск да сваіх сяброў. Пакідаем сімвалічны зніч, кветку. На працягу трох дзён школа адкрытая для выпускнікоў, таму ў нядзелю ёсць час на сустрэчы ў класах. На папярэднім з'ездзе прафесар Красоўскі сустрэўся з адным са сваіх класаў і пасля некалькіх дзесяткаў гадоў правёў урок матэматыкі. Помню, калі дырэктар Карпюк прынёс свае занатоўкі шматгадовай даўнасці. Вядома, гэта ўжо не тыя парты, не так выглядае школа, але хочацца, каб успаміны вярнуліся.

З'езд, паводле яго арганізатараў, гэта не толькі добрая гульня, але таксама і канкрэтная ідэя.

Пётр Божка:

— Кантакт і пашана для школы гэта наша супольная мэта і цешыць, што сярод маладых абітурыентаў з'явілася ўжо патрэба вяртацца ў школу. Атмасферу ў школе не будуюць толькі настаўнікі, якія там працуюць пастаянна, але таксама вучні, хаця яны змяняюцца. Тое, што яны ўражлівыя на спосаб трактоўкі, на пачуццё справядлівасці — гэта адлюстраванне спосабу працы, добразычлівасці з боку школы. Такая атмасфера будзе спрыяць вяртанню выпускнікоў на з'езды, іх зацікаўленню школай, таксама і дапаможнасці.

— Зразумела, што з'езд адбываецца таму, што ў школе такія выпускнікі і што яна прэстыжная, — дадае дырэктар. — З другога боку хочам пакарыстацца нагодай і зрабіць сваю прапаганду. Можам пахваліцца вядомымі выпускнікамі, якія дайшлі высока, дзякуючы сваёй працы, але таксама і таму, што закончылі наш ліцэй. Пры нагодзе запрашаю на вэб-старонку ліцэя (**www.lozbjn.edu.pl**), ёсць там запрашэнне, праграма і база выпускнікоў з пяцью тысячамі прозвішчаў. Праверце, калі ласка, ці мы добра ўвялі вашы прозвішчы, пішыце, калі трэба нешта выправіць. Мы гэта рабілі на аснове дакументаў, а базу даных, што варта адзначыць, стварылі нашы вучні.

З'езд для шматлікіх выпускнікоў мае вельмі сямейнае і асабістае вымярэнне. Успамінае Пётр Божка:

— Мая мама была вучаніцай гэтай школы, мы з жонкай у ёй вучыліся, а зараз і сын пачаў другі клас. Бачу, якія змены пракаціліся праз школу. Зараз моладзь больш свядомая сваіх правоў і магчымасцей, а школа мае абавязак мабілізаваць і экспанаваць моцныя рысы кожнага вучня, інакш рыхтуе да далейшага жыцця, бо часы змяніліся. Аднак трэба дбаць, каб атмасфера прыцягвала, каб для кожнага ўдзельніка было гэта свята, часам сямейнае, як у нашым выпадку. Мы з жонкай у ліцэі пазнаёміліся. Я быў вучнем другога класа, жонка — першага. Не магла яна здабыць кніжкі да нямецкай мовы, а я падарыў ёй падручнік і ўзамен папрасіў схадзіць у кінатэатр. „Уцёкі з Алькатраса" паказвалі. Мала рамантычна (*смех*).

— Ужо можаце планаваць час на наступны з'езд, — запрашае Андрэй Сцепанюк. — Неафіцыйна і традыцыйна ўжо прынята, што праходзіць ён кожныя пяць гадоў.

А Пётр Божка дадае яшчэ анекдот:

— У мінулым, помню, з'езд ужо пачаўся і ў пэўны момант у залу ўвайшла жанчына з валізкамі ў руках. Аказалася, што самалёт спазніўся. Яна не паспявала, таму нават не паехала ў гатэль, толькі з валізкамі прыйшла на з'езд. Гэта доказ, як важная кожная хвіліна такой сустрэчы для нашых выпускнікоў.

*Пётр Божка, старшыня Арганізацыйнага камітэта VII З'езда выпускнікоў II Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім*

Фота архіў Нівы

9 770546 196000

# Па новым Шоўкавым шляху

Ці прыжывуцца ў Беларусі кітайцы? І ці можна перарабіць беларусаў на кітайцаў? Гэтыя, дзіўныя з першага погляду, пытанні прыйшлі мне ў галаву на фоне апошніх вестак пра дачыненні нашых братэрскіх народаў, сувязі паміж якімі паслядоўна мацуюцца з году ў год, нягледзячы на геаграфічную далёкасць. Спакваля наладжваецца, так бы мовіць, новы Вялікі шоўкавы шлях. Насамрэч паміж беларусамі і кітайцамі не так ужо мала агульнага. Нягледзячы на тое, што нас, па даных апошняга перапісу (якія ўрэшце абнародавалі), толькі дзевяць мільёнаў пяцьсот тысяч, а прадстаўнікоў Паднябеснай ажно адзін мільярд дзвесце мільёнаў, а то і больш. У іх пласт вялікай эпохі і культуры і ў нас слаўнае мінулае Вялікага Княства. У іх палітычны рэжым з мудрым і дальнабачным кіраўніцтвам дзяржавы і ў нас тое ж. У іх ажно тры рэлігіі — даасізм, будызм і канфуцыянства. І ў нас тры асноўныя канфесіі, хоць усе хрысціянскія, але непрымірымыя — праваслаўе, каталіцтва і баптызм. І тут і там спорт узведзены ў ранг дзяржаўнай палітыкі. Ну а пра працавітасць кітайцаў і беларусаў ходзяць цэлыя легенды. Ды вось недарэчнасць. Прыехала летась на Пружанскую зямлю група першапраходцаў-аграрыяў з краіны Хань. Зарэгістравалі прадпрыемства і пасадзілі звычайную гародніну. Нібыта і ўраджай вырас неблагі, але па нейкіх незразумелых прычынах аграпрадпрыемства збанкрутавала і развалілася. Сёлета ў тым жа раёне з Паднябеснай высадзіўся іншы дэсант працаўнікоў раллі. На гэты раз пасадзілі ў два разы болей. Як казаў некалі даўні кіраўнік аднаго з нашых выканкамаў: „Мы расшырым плашчадзя і увялічым машчнасця!". Ды вернемся да пружанскага сельскагаспадарчага эксперыменту. Афіцыйныя асобы з мясцовай „вертыкалі" кажуць, што нават некалькі каліваў памідораў завязалася. Але нешта зноў не пайшло — па адной з версій замест ранняй капусты пасадзілі познюю моркву, а потым наадварот. Можа моўнае непаразуменне выйшла. Невыпадкова ж у школах Мінска ўжо сталі навучаць іерогліфам, свая то мова мала функцыянальная, нічога вялікага на ёй не выкажаш.

Па іншай версіі да лятальнага зыходу прывяло тое, што да кітайцаў на працу не пайшлі мясцовыя прафесіяналы бараны і матыкі. Маўляў, мы на суніцах ды лісічках больш заробім. Словам, урэшце ўсё на гэтых эксперыментальных дзялках пагніло і зарасло бур'яном. Паводле інвестыцыйнага праекту наватары павінны былі таксама прывезці адмысловыя кітайскія цяпліцы, але яны так і не даехалі, а з мясцовых матэрыялаў бедныя азіяты збудаваць нічога не змаглі. Так і сядзяць на тэрыторыі былога вайсковага гарадка. Мясцовыя жыхары наракаюць, што смецяць моцна на вуліцах.

Можа таму днямі ў Беларусь і прыбыла прадстаўнічая кітайская дэлегацыя ажно з шасці парламентарыяў на чале з нейкім Цзян Шушэнам. Амаль Шушкевіч па-іхнаму. І хоць у праграме афіцыйнага візіту прыезд на Пружаншчыну не значыцца, усё ж закрадваюцца лагічныя падазрэнні — прыехалі народныя абраннікі разбірацца, чаму на гэтай глебе ніяк не прыжываецца пекінская капуста. Усе мы разумеем, што наведванне, прыкладам, дзяржаўнай акадэміі музыкі — толькі для адводу вачэй. Вочы ўрэшце можна і прыжмурыць — яшчэ больш падобнымі станем.

Цяпер трэба ўсім думаць, як выйсці з гэтай сітуацыі і чым зможа дапамагчы вялікі Кітай малой Беларусі. І тут на памяць прыходзіць адзін чыста беларускі анекдот. Сустракаюцца два сябры і адзін пытае: „Чаму ты такі сумны, што здарылася?" — „Ды вось жонка мая зацяжарыла, будзе ў нас ужо чацвёртае дзіця" — адказвае з уздыхам той. — „Дык гэта ж вялікая радасць!" — „Яно то так, але баюся, што кітаец народзіцца". — „Чаму так?". — „Ды я чытаў, што кожны чацвёрты жыхар нашай планеты, які нараджаецца — кітаец". — „Дык гэта ж у агульнай статыстыцы зямлі, а ты ж — беларус, жонка — беларуска, чаму ж дзіця кітайцам народзіцца!?". — „А чаму першыя трое дзяцей — кітайцы?"...

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Жыць у страху (1)

Калі ў авіякатастрофе пад Смаленскам загінуў архіепіскап Міран, вернікі з Гайнаўкі, якія ездзілі ў Варшаву, каб памаліцца ля труны ўладыкі, ставілі пытанне чаму менавіта так здарылася з архіепіскапам. Святары адказвалі, што нельга ставіць такіх пытанняў, толькі маліцца за ўпакаенне душы архіпастыра. Падобныя пытанні маглі ставіць сямейнікі загінуўшых у катастрофе, палякі, беларусы ці расіяне, якія сачылі за інфармацыямі ў масмедыях пасля авіякатастрофы. Некаторыя нават сталі называць Смаленскую зямлю праклятай. Айцец Гаўрыіл у праваслаўным асяродку ў Крыўцы тлумачыў, што няма праклятай зямлі, што Смаленскую зямлю можна лічыць святой, бо адтуль у Супрасльскі манастыр прыбыла ікона Божай Маці, якая на ўсходзе называецца Смаленскай, а ў нас называюць яе Супрасльскай.

Гэты год быў асабліва багатым на катаклізмы не толькі па Еўропе. У жніўні трэба было змагацца з велізарнымі пажарамі лясоў у Расіі, якія нішчылі вёскі, хутары, а нават сталі падыходзіць пад вайсковую часць з ядзернай зброяй. Па Іспаніі, а раней па Грэцыі вятры таксама распаўсюджвалі вялікія пажары. Вельмі моцныя паводкі прайшлі праз Кітай, Пакістан і Індыю, у час якіх ад вады пацярпелі мільёны людзей. Многія з іх асталіся без даху над галавой, тысячы — страцілі жыццё. Вялікія паводкі наведалі таксама еўрапейскія краіны, у тым ліку і Польшчу. У маі, чэрвені і жніўні тры вялікія паводкі пакінулі па сабе велізарныя шкоды, якія спасцігілі звыш ста тысяч людзей на поўдні, захадзе і паўднёвым-усходзе краіны. Вада пазалівала дамы, якія будаваліся пакаленнямі. Многія людзі страцілі амаль усю маёмасць. Грошы, атрыманыя ад страхавальных агенцтваў, дапамога дзяржаўнага бюджэту, іншых устаноў і людзей добрай волі кампенсуюць толькі частку выдаткаў. За іх складана вярнуць хатам даўні выгляд або хаця зрабіць іх прыдатнымі на жыллё. Некаторыя пацярпеўшыя ад паводкі толькі нядаўна збудавалі дамы або іх адрамантавалі пры дапамозе крэдытаў і зараз вымушаны іх вяртаць. Аднак матэрыяльна яшчэ больш патрацілі людзі, якіх дамы цалкам разваліліся, як картачныя домікі, бо падмытая або раскіслая зямля, што знаходзілася на акраіне ўзгоркаў, апаўзла пад імі. У час гэтай стыхіі загінулі людзі, а ў многіх паявіліся нервовыя і іншыя хваробы. Тут таксама часта паяўлялася пытанне чаму такое здарылася. Выступаючым перад тэлекамерамі слёзы і перажыванне не давалі гаварыць.

Хаця вялікія паводкі ўвогуле не спасцігілі толькі паўночна-ўсходняй часткі нашай краіны, дзе мы жывем, то дайшлі да нас ураганы, вялікія дажджы, а град нішчыў пасевы. У пачатку жніўня бура затрымалася над Гайнаўкай, а ўраганны вецер ламаў дрэвы, вада залівала вуліцы, панадворкі і падвалы дамоў. Пажарнікі мелі тады многа работы. Канешне, у Гайнаўцы ці Беластоку ад ураганаў не было такіх вялікіх страт як на поўдні ці захадзе нашай краіны, але ўжо ў наваколлі Граева вецер знішчыў будынкі, а побач Кляшчэляў 13 жніўня выпаў вельмі вялікі град, велічынёй мячыкаў для настольнага тэніса. У Гайнаўскім доме культуры летам адбылося спатканне з прафесар Альжбетай Мальзан, загадчыцай Гайнаўскага замясцовага аддзялення Політэхнічнага інстытута ў Беластоку „Упраўленне асяроддзем". Выступіла яна з дакладам „Небяспекі спалучаныя са зменамі клімату". Сабраныя даведаліся тады наконт небяспечных для людзей кліматычных змен, паслядоўнасцю якіх з'яўляюцца, між іншым, цяперашнія ўраганы, вялікія паводкі і доўгія засухі. Калі дабавіць да іх яшчэ землятрусы і вывяржэнні вулканаў, то перад звычайным чалавекам ствараецца вельмі сумны воблік нашай будучыні на Зямлі. Толькі ад урагану Катрына, які ў 2005 годзе прайшоў праз Паўночную Амерыку, пацярпелі сотні тысяч людзей. Апошнім часам штогод над акіянскімі водамі ствараюцца пад 5 моцных ураганаў, якія часта наведваюць Злучаныя Штаты Амерыкі.

**Аляксей МАРОЗ**

**Вачыма еўрапейца**

## Семяноўка-2012

Больш за 17,5 млн. зл., з гэтага ліку 85% сродкаў, значыць, каля 15 млн. зл. са Швейцарска-польскай праграмы супрацоўніцтва, паглыне мадэрнізацыя, а ў прынцыпе будова амаль ад асноў польска-беларускага чыгуначнага пагранпераходу ў Семяноўцы, які існуе тут з 1969 г. Перадача яго ў карыстанне плануецца на 2012 год. У будучым годзе поўным ходам рушыць будова.

— Мы здалі экзамен. Гэтыя грошы будуць тут, — не скрываў задавальнення ў час прэс-канферэнцыі падляшскі ваявода Мацей Жыўна пасля г.зв. студыйнага візіту ў Швейцарыю, дзе разам з прадстаўнікамі падляшскай часці Пагранічнай стражы і Мытнай палаты канчаткова пераканаў швейцарскіх партнёраў да фінансавання гэтай інвестыцыі.

Ваявода адзначыў:

— Швейцарцам вельмі залежыць на пагранпераходзе ў Семяноўцы, бо чым шчыльней будзе на ім, тым менш будзе работы з мытным кантролем. Тавары, перасякаючыя мяжу на гэтым пагранпераходзе, трапляюць таксама ў Швейцарыю [м.інш. драўніна — М. Х.].

Прысутны ў час канферэнцыі (а таксама ў Швейцарыі) камендант Падляшскай часці ПС Лешак Чэх сказаў:

— Маю надзею, што пасля пуску гэтага пагранпераходу павялічыцца на ім рух, прынамсі ўдвая. Зможа карыстацца ім, напрыклад, ІКЕА, якая будуе фабрыку ў Орлі.

Дадаў таксама, спасылаючыся на размовы ў Швейцарыі і назіранні працы тамашніх памежна-мытных службаў:

— Швейцарыя з'яўляецца толькі асацыяваным сябрам ЕС, але належыць да Шэнгенскай групы [магчымасць перасякання мяжы асобамі і таварамі без пашпартна-мытнага кантролю — М. Х.]. Не ўдасца перанесці адтуль усіх узораў на нашу польска-беларускую мяжу. 70% грузаў на мяжы Швейцарыі едзе па пуцях. Аўтафуры могуць там рухацца на дарогах толькі ў гадзінах 22-5. Апрача таго за такі транспарт бяруць высокую плату.

Ваявода:

— Памежны чыгуначны транспарт павінен стацца таксама і ў нас канкурэнтным. У Базелі мы бачылі, як на швейцарска-нямецкім пагранпераходзе, дзе тавары транзітам перавозіліся таксама ў Італію, на практыцы прымяняецца лозунг „аўтафуры на пуці". Швейцарцы адыходзяць ужо ад чыгуначнага транспарту аўтафур да перавозу саміх кантэйнераў.

Сярод аб'ектаў, якія з'явяцца на пагранпераходзе ў Семяноўцы, апынецца мадэрна абсталяваны павільён для фітасанітарнага кантролю. Ева Стаховіч, намеснік дырэктара аддзела інфраструктуры Падляшскай ваяводскай управы:

— Магчымасць спраўнага фітасанітарнага кантролю вельмі важная, паколькі дазволіць павялічыць колькасць атрымліваных і перасыланых далей грузаў.

Мацей Чарнэцкі з беластоцкай Мытнай палаты тлумачыў журналістам: „Тэхніка адпраўкі не памяняецца, значыць — пераход з шырокіх на вузкія пуці і наадварот".

Ваявода Жыўна заўважыў: „Гэты пагранпераход будзе істотным так для самой Семяноўкі і ваколіц, як і для ўсяе гміны".

Пісалі мы ўжо ў „Ніве" пра Нарвежскі фінансавы механізм, з якога грошы ідуць на пагранпераход у Кузніцы-Беластоцкай ды пра Трансгранічную праграму: Польшча — Украіна — Беларусь (2007-2013) — на дафінансаванне пагранпераходу ў Полаўцах. Пры нагодзе прэс-канферэнцыі ў справе Семяноўкі аказалася, што на пагранпераходзе ў Кузніцы, дзякуючы нарвежскай падтрымцы, паявіцца яшчэ 55 камер для маніторынгу, побач 88 ужо ўстаноўленых, а ў Полаўцах знайшліся яшчэ грошы на дадатковы павільён для кантролю.

Усё паказвае на тое, што праз 2-3 гады прынамсі пагранпераходы на польска-беларускай мяжы ў Семяноўцы, Полаўцах і Кузніцы будуць самымі мадэрнымі і — найважнейшае — самымі шчыльнымі на вонкавых межах Еўрасаюза.

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

# Храмы і птушкі



Таямнічая каплічка-стэла каля Воўкушаў

**Даўнавата не быў я ўжо ў Кузніцы і мястэчка за той час выразна змянілася. Завітала ў гэтую мясцовасць Еўропа. А ўсё гэта сталася ў выніку пракладкі новай шашы, па якой трансгранічны рух пакінуў утаптанае гадамі месца ў цэнтры мястэчка. Перабудаваны чыгуначны вакзал цяпер амаль пусты. Пуста і на вакзальнай плошчы, на якой калісь тоўпіліся масы дзелавога народу. Хаця адзін турнікет аўтамабільнай стаянкі паламаны, аўтамабілі не карыстаюцца дармовай нагодай пастаяць там. На галоўнай вуліцы мястэчка таксама пуставата, пуставата і на адведзеным на базар участку. Некалькі там машын і каля двух дзесяткаў дзелавых асоб, якія, здаецца, чакаюць толькі даверaных сабе памежных бізнесменаў. На базары негаманліва, відаць адбываецца там такая дзейнасць, якая патрабуе сакрэтнасці. Кароткія фразы выказваюцца на запаветным найслаўнейшаму ўраджэнцу Кузніцы Міхалу Каяловічу „общепонятном языке”.**

Каля мураванага касцёла, пабудаванага ў 1860-64 гадах — акурат да мураўёўскага раскаталічвання, навінка: новы помнік прысвечаны „ўсходнім лёсам палякаў”. Таксама перад касцёлам пасаджаны два дубочкі ў памяць двух жыхароў Кузніцкай гміны, якія загінулі ў Катыні. Раней у Кузніцы былі два драўляныя касцёлы; першы з іх пабудаваны быў пры Жыгімонце Старым у 1545 годзе, наступны — у пачатку XIX стагоддзя. Самастойная парафія ў Кузніцы ўзнікла ў 1601 годзе; раней мястэчка было ў складзе Адэльскай парафіі.

Напалеон Роўба ў 1909 годзе пісаў: „Kuźnica, m-ko w pow. sokolskim, gub. grodzieńskiej, nad rz. Łososną, o 22 w. od Grodna i 15 w. od Sokółki położone. Dawniej był tu klasztor Bazyljanów, który następnie został przerobiony na cerkiew. Kościół parafjalny murowany, wzniesiony na nowo z muru w r. 1860, przez ks. Pisankę. Ludność m-ka około 1300 osób. Przy miasteczku stacja kolei żel. Warsz.-Petersb. Zarząd policyjny i zarząd gminny. Jako królewszczyzna, Kuźnica, w ostatnich chwilach Rzeczypospolitej była w posiadaniu Ant. Tyzenhauza. Godnem jest zanotowania, iż w okolicy Kuźnicy często poławiają się pstrągi”.

У той жа сам час энцыклапедыя Брокхаўза і Эфрана паведамляла: „Кузница заштатный (с 1808 г.) гор. Гродненской губ., Сокольского у., на р. Лососне. Жит. 1686 (православных 85, римско-католического испов. 586, евреев 940). Церковь православная 1, римско-католическая 1, синагога 1, 2 еврейских молитвенных дома, училище”. І пра раку Ласосну там жа: „Лососна р. Гродненской губ., приток р. Немана. Длина течения 35 в. Л. протекает по уезду Сокольскому и Гродненскому, и по ней сплавляют лес в незначительном количестве. В 1837 г. на берегу Л. найден скелет мамонта”.

Кіруюся ў бок Войнаўцаў, але прыцягваюць мяне адкрытыя дзверы тамашняга Гміннага асяродка культуры і спорту. У калідоры сядзіць двух мужчын; пытаю іх пра мясцовую бібліятэку. А была калісь, адказваюць мне, але цяпер яе ўжо няма. На маё здзіўленне адсутнасцю гэтакай установы ў гміннай мясцовасці падказваюць мне высветліць гэтае пытанне ў войта, які ў суседняй канферэнц-зале; акурат там перапынак. Але з залы паказваецца сакратар Гміннай управы і ў яго я асведамляюся пра чытальніцкую ўстанову. Бібліятэка ў Кузніцы працуе, толькі памяняла ранейшы адрас і цяпер яна ў будынку пажарнага дэпо. Цікаўлюся ў субяседніка наяўнасцю гміннай манаграфіі, але такой яшчэ мясцовая гміна не выпусціла; магчыма, што ў бібліятэцы ёсць нейкія кнігі пра самую Кузніцу…

Калі невядома канкрэтна пра мясцовы даведнік, тады мяркую сам высветліць некаторыя тамашнія загадкі. А першую загадку быў калісь паставіў пакойны Мікола Гайдук. Менавіта ў 44-м нумары „Нівы” з 1981 года пісаў ён пра царкву ў Войнаўцах. Паколькі пра яе зараз зусім ціха, рашыў я праверыць у чым справа. Зайшоў я пад кузніцкую царкоўку, а там прыемная нечаканасць: на стэндзе перад веснічкамі сціплы лісток з гісторыяй Кузніцкага прыхода, але пра царкву ў Войнаўцах там ні слова. А таму пра Войнаўцы не было там згадкі, бо розныя людзі бачаць і ўспрымаюць навакольны свет па-рознаму. Гэтаксама і наш колішні даследчык мясцовай даўніны пакарыстаўся сваёй уласнай тапаніміяй, іншай чым цяпер прынята і гэта не ў загану яму, бо кузніцкая царква — можна сказаць — папросту прытуляецца да Войнаўцаў…

У кузніцкім маёнтку — паведамляе прыхадскі даведнік — царква была ўжо ў XVI стагоддзі. У пачатку XIX стагоддзя ў Кузніцы была ўзведзена новая царква. Вернікі, што падаліся ў бежанства ў Першую сусветную вайну, закапалі найбольш каштоўныя царкоўныя прадметы, але яны цягам вайны прапалі; была паднішчана і сама царква. Чарговая вайна была больш жорсткая і кузніцкая царква згарэла ў час пажараў, якія ахапілі ўсю мясцовасць. Пабудаваная ў 1944 годзе новая царкоўка згарэла ў наступным годзе ад падпалу. Цяперашняя кузніцкая царква была ўзведзена ў наступным, 1946 годзе.

Гэта, аднак, толькі частка войнаўска-кузніцкай гісторыі, якая была шчыльна звязана з супрасльскім манастыром. Кузніца, заснаваная на правым беразе рэчкі Ласоснай, атрымала гарадское права ад каралевы Боны ў 1546 годзе. Тут мелі працаваць кузні для гарадзенскага замка; сыравінай для іх мела быць руда, што залягала ў рачной даліне, а апрацоўваць яе мелі кавалі, што былі паселены ў адлеглай у два кіламетры на поўнач ад Кузніцы вёсцы Кавалі. На супрацьлеглым, левым беразе Ласоснай, узнікла вёска Войнаўцы, якая сваю назву ўзяла ад ейнага ўласніка Лаўрына Войны. Чарговыя ўласнікі вёскі, Міцуты, падарылі яе ў 1743 годзе Супрасльскаму базыльянскаму манастыру; таму Войнаўцы называлі таксама Кузніцай-Базыльянскай. Сваякі Міцутаў, Боўфалы, таксама падтрымлівалі пазней кузніцкі манастыр…

З Войнаўцаў жвіроўка вядзе быццам на захад, у напрамку Воўкушаў. Паміж гэтымі вёскамі калісь былі палі, але апошнімі дзесяцігоддзямі яны шмат дзе пазарасталі лесам; некаторыя палеткі зарастаюць зёлкавым самасеем. А дарога не простая, яна крыжуецца з іншымі дарогамі, якімі земляробы даязджалі калісь на свае ўчасткі. У лесе гэтыя скрыжаванні не пазначаны ніякімі дарожнымі знакамі і трэба адно здагадвацца, куды павярнуць свой маршрут. І так перамяшчаўся я па тых лабірынтах быццам іграючы на скрыпцы: то направа пацягнуся, то налева; „нотным запісам” была мне пазіцыя сонца. Такім спосабам дабраўся я да нейкіх каляшашэйных збудаванняў і на першым панадворку пашчасціла мне ўбачыць сядзеўшага ў цянёчку пажылога мужчыну; у яго я і асвядоміўся, што там пачатак Воўкушаў. Расказаў ён мне як прайсці далей, у напрамку асаблівага тамашняга помніка, а нават хацеў мяне туды падвезці на машыне; добрыя людзі жывуць у нашых вёсках…

Менавіта паміж Воўкушамі і беластоцка-гродзенскай шашой стаіць незвычайнае збудаванне, пра якога пачаткі зараз няма верагодных вестак — высокая каля пяці метраў каплічка-стэла з чырвонай цэглы на квадратнай цагляна-каменнай аснове, якую зуб часу кранае з паўднёвага боку, але з паўночнага яшчэ трымаецца тынк. Мікола Гайдук пісаў быў і пра яе ў 50-м нумары „Нівы” з 1980 года. Калісь у нішы каплічкі была выява пелікана, якую пастушкі збілі, цаляючы камянямі.

Чаму акурат пелікан? Даўным-даўно гэтая птушка лічылася асабліва дбайнай пра сваіх вывадкаў, якіх, у выпадку нястачы ежы, карміла — паводле легенды — сваім выдзеўбаным з цела мясам. Таму раннехрысціянскія тэолагі параўноўвалі пелікана з Ісусам Хрыстом, які ахвяраваў сваё цела і кроў дзеля выратавання чалавецтва. Вось такім чынам пелікан сімвалізуе ўсе Хрыстовы пакуты, а каплічка з яго выявай становіцца свайго роду Кальварыяй.

Іншыя даследчыкі мяркуюць, што ў каплічцы была выява арла, які сімвалізуе евангеліста Іаана, а гэта мела б сведчыць пра ранейшае існаванне ў гэтым месцы царквы, якой гэты прарок меў быць заступнікам. Нічога ў гэтым меркаванні дзіўнага — арол жа ў нашым старонні — сімвал сілы нашых каралёў, цароў, кайзераў — увайшоў нашаму народу ў кроў і яго ў ніякім выпадку нельга ўпускаць з віду. Вось у адным куточку Гродзенскай вуліцы Саколкі красуецца каменная кампазіцыя з каменным арлом, на жаль, ананімная — відаць чакае наступу нейкай ахвяравальнай моды. А на цэнтральным пляцы горада невялічкі пастамент з яшчэ іншай птушкай — сакалком, ад якой пайшла і назва горада. І зусім непадалёку ўзводзіцца новае сакральнае збудаванне — званіца сакольскай царквы. Бо ж гэты элемент архітэктурнага пейзажу — як фенікс.

Каплічка ў Воўкушах

Нараўчанская гміна

## Найпрыгажэйшыя сядзібы

З верасня на сесіі Рады Нараўчанскай гміны (Гайнаўскі павет) былі ўручаны дыпломы і грашовыя ўзнагароды пераможцам гміннага конкурсу „Найпрыгажэйшыя сядзібы 2010 года ў Нараўчанскай гміне".

У катэгорыі „прыхатні кветкавы агародчык і падворак" узнагароду гран-пры атрымалі Люба і Лявон Кардашы з Тарнопаля. Два раўнапраўныя першыя месцы занялі Галіна Вяжхоўская з Заблотчыны і Лена Харкевіч з Плянты, другое — Люба Бельская з Тарнопаля ды два раўнапраўныя трэція месцы — Галіна Бірыцкая і Юрка Крынскі з Плянты. У катэгорыі „сядзіба" ўзнагароду гран-пры атрымалі Таіса і Ян Драўноўскія з Міклашэва. Першае месца заняла Крыстына Бельская з Тарнопаля, два раўнапраўныя другія месца занялі Зіна Раманчук з Альхоўскі і Анна Ігнатовіч з Семяноўкі ды два раўнапраўныя трэція месцы — Вера Шыкула з Новага Ляўкова і Валянціна Германюк са Скупава. Вылучэнні атрымалі шэсць сядзіб: па дзве з Семяноўкі (Анатоль Матысюк ды Ніна і Лявон Лукшы), з Тарнопаля (Станіслава Засім і Валянціна Янель) і з Заблотчыны (Юлья Бядрыцкая і Ніна Валкавыцкая). Варта адзначыць, што ўсе вышэйзгаданыя сядзібы вельмі прыгожа добраўпарадкаваныя і дагледжаныя. **(яц)**

## Купецкая кемлівасць

У Чаромху на рынак прыязджаюць купцы з розных бакоў Беласточчыны, бо кажуць, што тут можна прадаць тавар. 14 жніўня, напрыклад, прыкмеціў я аўтамабіль загружаны хлебабулачнымі вырабамі. Нічога не было б асаблівага, калі б не факт, што тавар прадаваўся... мяшочкамі. У адным змяшчаўся хлеб рознага віду, у іншым булачкі звычайныя і салодкія, а яшчэ ў іншым здобныя халкі.

— Колькі ў гэтым мяшочку хлеба? — пытаю прадаўца з машыны.

— Не лічылі... З учарашніх „звротаў", — тлумачыць мужчына. — Пякарні крызіс пражываюць. Мука на 20 грошаў падаражала, затым і цана печыва павысілася. Збыту няма. Гайнаўскія прадпрымальнікі на дваццаць працэнтаў прадукцыю абмяжоўваюць...

— Колькі за хлеб цэніце?

— Дзесяць злотых, за булачкі ды халкі — па шэсць.

Я выбраў мяшочак халак. Паклаў я на ровар незвычайну закупку, бо дагэтуль не прыходзілася мне купляць хлебабулачныя вырабы ў такой колькасці.

— Адкуль будзеце? — кідаю на развітанне ў бок гаваркога суразмоўцы.

— З-пад Беластока, з Тураслі-Касцельнай...

Прыехаў я дамоў і хвалюся дачцы ды ўнукам незвычайнай пакупкай, а яна кажа: — Я раней гэты аўтамабіль прыкмячала, але нічога не гаварыла, бо невядома праз якія рукі гэтыя вырабы праходзілі. Гэта ж спажывецкі тавар...

Палічыў я свае халы. Было семнаццаць штук. Выпала мне 35 грошаў за адну штучку. Паклаў я халкі ў фольгавыя мяшочкі і схаваў у маразілку. А калі спатрэбяцца, дык вымаю і спажываю. „Дешево и сердито (смакавіта!)" — кажуць рускія. І я так кажу.

**Уладзімір СІДАРУК**

# Летапіс чаромхаўскай адукацыі

**Уладзімір СІДАРУК**

(4)

**Паколькі першы пажар не ўчыніў перабояў у функцыянаванні школы, дык другі, які ўспыхнуў наступнага дня а восьмай вечара, паўплываў на пагашэнне печкі цэнтральнага ацяплення. У тушэнні пажару актыўна ўдзельнічалі школьнікі, а пасля паспяшылі з дапамогай чыгуначнікі. Пажар канчаткова быў пагашаны. У гэтым годзе памянялі праграму навучання матэматыкі і знеслі навучанне рэлігіі ў школе. У перыядзе навучальнага года школа адзначала такія святкаванні, як Дзень польскага войска, Кастрычніцкай рэвалюцыі, 1 Мая, Ленінскія дні, Сістэмы дружбы і супрацоўніцтва паміж Польшчаю і СССР, Міжнародны дзень дзіцяці і Дзень перамогі. Асноўнымі задачамі кіраўніцтва школы лічыла: збудаваць гаспадарчае памяшканне, нанесці тынкоўку звонку школы, зрабіць закупку швейных машын для рукадзельнай майстэрні, наладзіць дамову з дырэктарам насычальні, каб дазволіў карыстацца завадскім аўтамабілем для перавозкі тавараў у школьную краму.**

У гэтым годзе вучылася 400 вучняў, сярод якіх знайшліся такія, што знішчалі школьную маёмасць: краны ва ўмывальніку, сталы, абсталяванне электратоку. Вясною школа рашылася збудаваць прыбіральню на панадворку. Для гэтай мэты абклала падаткам бацькоў школьнікаў, але задума канчаткова была адменена. Бацькоўскі камітэт з Педагагічнай радай хадайнічалі за тым, каб перанесці дзіцячы садок у асобны будынак.

У 1962/63 навучальным годзе кадры школы дапаўняюцца выпускнікамі Настаўніцкай студыі. На працу паступае сужонства Марыя і Уладзімір Сцепанюкі (Марыя займаецца музычным выхаваннем, Уладзімір навучае гісторыі), затым: Надзея Вашкевіч — матэматыкі, Ян Смык — навучанне польскай мове. Надалей засталіся працаваць: Вера Бахарэвіч, Леантына і Людвік Бартосякі, Ніна Бірылка, Яўген Давідзюк, Сафія Гаўрылюк, Крыстына Гофман, Ольга Пацэвіч, Яніна Скок, Стэфан Шыманскі ды Марыя Шостак. У студзені і лютым прыходзяць Тэрэза Рынкевіч і Тэрэза Мусюк. Адышлі: Станіслава Барыцкая, Мікалай Гарадкевіч і Крыстына Гофман. Мікалая Гарадкевіча назначылі кіраўніком Дома культуры „Калеяж", а Крыстыну Гофман — інструктарам гэтай установы. Змяняе пасаду і Людвік Бартосяк. Яго перамяшчаюць у Гайнаўскае аддзяленне асветы на інструктара асветы для дарослых. Да канца навучальнага года абавязкі кіраўніка школы даручаюць Леантыне Бартосяк.

У гэтым годзе школа ўдзельнічала ў святкаваннях 50 гадавіны смерці Баляслава Пруса, 120 гадавіны нарадзін Марыі Канапніцкай і 20 гадавіны смерці Януша Корчака. Затым быў аб'яўлены конкурс „Тысячагоддзе Польскай дзяржавы". Тэмай „Нашы нацыянальна-вызваленчыя змаганні" займаліся вучні V — VII класаў, а „Казкі і легенды" вучні II — IV класаў. У рамках гэтай тэматыкі змяшчалася адзначэнне 900-годдзя Бельска-Падляшскага. Конкурсныя працы ацэньвала журы: Людвік Бартосяк, Ян Смык, Уладзімір Сцепанюк і Ніна Бірылка.

http://www.czeremcha.com.pl

У кастрычніку 1962 года школа атрымала пліткі на тратуар, краевугольнікі і пустакі. Пракладкай займаўся бацькоўскі камітэт і апошнія бацькі школьнікаў. У тым жа годзе падключылі школу да водаправода. Ад 5 лістапада пачалося падкормліванне, а з 15 лістапада стаў працаваць агульнаадукацыйны курс сёмага класа для дарослых. Для тых, хто не прад'явіў пасведчання з апошняга класа (шостага) была вызначана экзаменацыйная камісія. Абавязвалі прадметы: польская мова, гісторыя, геаграфія, фізіка, матэматыка і біялогія. Удзельнічала 19 слухачоў. Навуку закончыла 14. Кіраўніком курсу была Марыя Шостак.

Навучальны 1962/63 год праходзіў пад лозунгам 100 гадавіны Студзеньскага паўстання. Тэмай займаліся на ўроках выхавання, польскай мовы і гісторыі. Ранішнія лінейкі і святочная вечарына прысвечаныя гэтай падзеі адбыліся ў студзені 1963 года, а з 6 да 15 лютага праходзілі элімінацыі конкурсу „Ці ведаеш традыцыі Студзеньскага паўстання і яго ход на Беласточчыне?".

Зімовыя канікулы праходзілі ад 27 снежня 1962 г. да 5 студзеня 1963 г. Пазаўрочныя заняткі ў час канікул праходзілі ў школьнай святліцы ад 10 да 14 гадзіны, а дзеткамі займаліся настаўнікі Уладзімір і Марыя Сцепанюкі, Ольга Пацэвіч, Ніна Бірылка, Вера Бахарэвіч, Надзея Вашкевіч, Стэфан Шыманскі і Крыстына Гофман. Арганізавалі каток. У тым жа часе былі праведзены лекарскія абследаванні. Школа змагалася з педыкулёзам (вашывае навучанне), Яўген Давідзюк, Ян Смык, Тэрэза Рынкевіч, Ольга Пацэвіч (завочна вывучала рускую мову ў Плоцку), сужонства Уладзімір і Марыя Сцепанюкі, Стэфан Шыманскі (завочнае навучанне на Фізкультурнай акадэміі ў Варшаве), Тэрэза Мусюк, Ніна Бірылка, Сафія Гаўрылюк і Надзея Петрушкевіч (Вашкевіч). Было 14 класаў. Функцыянавалі класы-майстэрні: рускай мовы, фізікі, матэматыкі, гісторыі, хіміі, біялогіі, геаграфіі, пластыкі і працы-тэхнікі. На выхаваўчых уроках заняткі праводзіліся арыентацыйна пад лозунгам „Выхаванне вучняў на добрых, высакародных грамадзян краіны, добрасумленна выконваючых абавязкі, валодаючых матэрыялістычным поглядам на свет і шануючых грамадскую маёмасць". У рэалізацыі задачы меў дапамагаць Саюз польскіх гарцэраў. Для ажыццяўлення гэтай арганізацыі былі вызначаны настаўнікі, для іх быў паменшаны час працы на два ўрокі.


http://www.czeremcha.com.pl

# Керкіра значыць Корфу

Тэкст і фота Юркі ЛЯШЧЫНСКАГА

Новы порт на Корфу, дзе здымаўся фільм пра Бонда

**Здавалася б, старажытнасць сустракаецца тут з сучаснасцю, а міфалогію ўбачыш на кожным кроку. Кожная трэцяя таверна, гатэль ці кавярня на гэтым востраве называюцца быццам героі „Адысеі" — калі не „Пенелопа", дык „Адысей", а ў крайнім выпадку „Алімп" або „Афіны". Нават да міфалагічных часоў адносіцца яго назоў — Керкіра. Гэта імя німфы, якую спакусіў закаханы Пасяйдон. Па-за Грэцыяй востраў больш вядомы як Корфу.**

Але, на жаль, мала ў ім захаваных, ці, лепш сказаць, адкрытых помнікаў старажытнасці. Вядома, справа не датачыць XV ці XVI стагоддзяў, бо для грэкаў гэта — учора.

Аднак Корфу мае і іншыя, не менш цікавыя асаблівасці. Мабыць, таму палюбілі яго Адысей і Пасяйдон — гэта ў старажытнасці. А ў мінулых стагоддзях англійскі пісьменнік Джордж Байран ці аўстра-венгерская імператрыца Елізавета, вядомая як Сіссі.

Корфу знаходзіцца на поўначы архіпелага Іанічных астравоў, паблізу Албаніі, у самым вузкім месцы праліва — усяго 2,5 кіламетра. Кажуць жартам, што раніцай жыхароў Корфу будзяць албанскія пеўні. Сам востраў даволі вялікі: даўжыня 60-65 км і 10-15 км шырыня. Формай востраў нагадвае Іспанію, мабыць, невыпадкова шмат мае з ёю супольнага. Корфу насяляе крыху больш за 100 тысяч чалавек, з чаго траціна або і больш жыве ў аднайменнай сталіцы. Доўгі час востравам валодала Венецыянская Рэспубліка. З таго часу захавалася шмат чаго ў помніках архітэктуры, культуры і ў... мове. І, вельмі істотнае, Корфу ніколі не заваявалі туркі. Таму нідзе не сустрэнем мусульманскай мячэці, а хутчэй каталіцкі касцёл. Вузкія вуліцы сталіцы сапраўды напамінаюць Венецыю. Праўда, кароткі час востравам валодалі французы і англічане — таксама пакідаючы свой след. Свой, на жаль, сумны след пакінула тут Сербія — ваенны могільнік сербскіх жаўнераў з часу І сусветнай вайны — ахвяр змагання з Аўстра-Венгрыяй. Але адно, што нязменнае ад стагоддзяў, мо тысячагоддзяў — гэта цёплае мора, пясчаны пляж і свежа-зялёная расліннасць. Дарэчы, Корфу лічаць самым зялёным востравам.

У свой час востраў расславілі мастацкія фільмы. Адзін, скажам, пра імператрыцу Сіссі з персанажам амерыканскай актрысы Ромі Шнайдар, і другі фільм — пра прыгоды брытанскага суперагента Джэймса Бонда — „Толькі для тваіх вачэй"; нядаўна пускалі яго на публічным тэлебачанні. Першы здымалі ў палацы Ахілон, які, дарэчы, спецыяльна ў канцы XIX стагоддзя для імператрыцы Елізаветы пабудавалі, вядома, у антычным стылі. Сам палац, асабліва дзесяткі „антычных" статуй, неяк спасылаецца на яе схільнасць да старажытнасці. Хаця самая магутная, 15-метровай вышыні статуя Ахіла з бронзы гэта ўжо заслуга пазнейшага гаспадара палаца, нямецкага кайзера Вільгельма II.

З Ахілона можна падацца ў сталіцу вострава — усяго 12 кіламетраў. Па дарозе, аднак, абавязкова трэба спыніцца ля вострава-манастыра Влахерна. Апроч бела-снежнай царкоўкі, спалучанай грэбляй з Корфу, непадалёк распаложаны аэрадром. І быццам над галавой пралятаюць самалёты, што тут прызямляюцца. На лётнішча можна паглядзець і зверху. Трэба толькі падняцца 50-60 метраў. Тут і таверна спакусіць кавай *фрапэ* — марожанай, або *ціцёбірай* — імбірным півам. Адно і другое — супер на грэцкую спякоту.

Пасля хвіліны адпачынку час наведаць горад. Я абраў сабе шлях ад старога да новага фартоў, хаця так папраўдзе і адзін, і другі, бадай, з XIV стагоддзя. Але адзін пабудаваны раней, другі — пазней. Стары форт акурат даступны для турыстаў, з верху якога дасканалы від на горад і ваколіцу. Другі форт надалей з'яўляецца мілітарным аб'ектам. Але вось менавіта пры другім форце здымалі фільм пра Бонда і шмат чаго пры гэтым папсавалі. Кажуць, што нават абвалілася сцяна абарончага рова — фосы. Ідучы ад аднаго да другога форта я задумаў заглянуць у напатканыя сакральныя аб'екты. На пяць храмаў толькі два былі сапраўды праваслаўнымі, два каталіцкімі (праўда, вельмі рознымі ад польскіх касцёлаў) і сінагога.

У Грэцыі як у праваслаўных, так і каталіцкіх храмах нармальнасцю з'яўляюцца лаўкі для вернікаў. І там, і там пераважаюць іконы з г.зв. італьянскай школы іканапісу — больш падобныя на каталіцкія абразы. Ну і галоўнае, бадай нідзе не ўбачыш такога паўсюднага ў Польшчы абраза — іконы Ісуса Міласэрнага. Тады — дзе я? У царкве, ці касцёле? Ну, у касцёле: тут жа няма іканастаса. Але гэта ўцяміў праз пару хвілін.

Затое ў бажніцы спыталіся ў мяне ці я яўрэй. Калі я запярэчыў, што ж нічога, бывае, наведаў храм, і нават ахвяру падаў на яго ў адмысловую скарбонку, за што жанчына, якая мяне прывітала ля ўвахода — усміхнулуся і падзякавала. Нібыта нічога, але ўсё-такі прыемна...

Апошнім храмам, у якім я даўжэй спыніўся, была царква святога Спірыдона — нябеснага заступніка Корфу. Сапраўды, заступніка! А ў той жа дзень акурат было прыхадское свята — 11 жніўня. Натоўп людзей стаяў у чарзе, каб пакланіцца мошчам святога. Так і я зрабіў.

Святы Спірыдон гэта вельмі важная постаць для вострава. Нарадзіўся ён на Кіпры ў IV стагоддзі, але яго мошчы, каб не трапілі ў рукі няверных туркаў-асманаў, найперш былі пераведзены ў Канстанцінопаль, а пасля яго падзення — на Корфу. Сярод жыхароў вострава распаўсюджваецца прытча пра яго заступніцтва. Малітвы да святога неаднойчы выратавалі Корфу ад голаду і эпідэміі, а двойчы, бадай, ад турэцкага нашэсця.

А было гэта 11 жніўня 1716 года, калі ўжо асманы ўварваліся ў горад. Тады разбушавалася такая навальніца, што туркі пачалі тапіцца ў сцякаючых па вуліцах патоках. Потым уцалелыя расказвалі, што бачылі нейкую постаць (святы Спірыдон), кідаючую ў іх перуны.

Дарэчы, традыцыя жыве і на практыцы. Кожны чацвёрты мужчына на Корфу называецца Спірыдон. А ў нас, як жыве традыцыя? Ці кожны чацвёрты называецца, скажам, Гаўрыіл або Коля?

А царква святога Спірыдона вельмі блізка да Лістону, шыкоўнага, быццам бы ў Парыжы, бульвара з многімі кавярнямі. Тут можна заказаць каву на розныя спосабы. І *фрапэ*, і па-ірландску, і па-італьянску, і па-грэцку. Гэтая апошняя ў іншых краінах называецца „кавай па-турэцку". Зроблены тут такі заказ сама меней быў бы палічаны знявагай, а і ў морду маглі б даць!..

Зусім непадалёк адсюль знаходзіцца новы форт, а крыху ўбок — адзін з большых палацаў у Грэцыі — Спянада, памятка з часу прысутнасці англічан (1816-1864). Спянада была створана дзеля гульні англічан у крыкет. А і зараз свае трэніроўкі мае тут зборная каманда Грэцыі.

У горадзе знаходзіцца некалькі, вартых наведання, музеяў — візантыйскі, антычнага мастацтва ці мастацтва Азіі. Гэты апошні — у палацы-сядзібе брытанскага камісара. Аднак маю ўвагу прыцягнуў зусім іншы музей — не абыякі, хаця маленькі: музей... банкнотаў. Цікава.

Стары порт на Корфу

З Бельска

## Дзіркі

Мінулі зіма, лета, пачалася восень, а шашу і так ніхто не паладзіў. На вуліцы Ягелонскай насупраць парафіяльнага дома віднеюць дзве дзіры. Асфальту ні грама, аж голае каменне відаць. Дарожнікі забыліся пра гэтую вуліцу? Гэтыя дзіры настолькі глыбокія, што калі едзеш увечары на веласіпедзе, можна ўпасці, а бяда доўга не чакае. Маю надзею, што адказныя ўлады справяцца з гэтай праблемай пасярод Бельска перад зімлю.

## Як прыгожа!

Як прыгожа выглядае кавалак вуліцы Хмельнай ад Белавежскай і Баторыя! Доўгі час тут былі лата на лаце і дзіры ў асфальце. Здавалася, нядоўгі кавалачак вуліцы, а ніяк не мог дачакацца рамонту. А цяпер — хоць каціся па новым асфальце і ходнічках для пешаходаў!

## Добрая крама

Па вуліцы Міцкевіча, 2, у Бельску працуе крама з мясам і каўбасамі, вытворцам якіх з'яўляецца мясны завод з Лукава. Тут ёсць добры выбар заўсёды свежага тавару, ну і ветлівыя прадаўшчыцы. Заходзьце за пакупкамі, пераканаецеся! **(жэм)**

## Прыемная сустрэча

Напрыканцы жніўня г.г. наведала мяне ў Бялках Эва Баровец з Кракава. Пані Эва — жонка Казімежа Бароўца, акцёра, які ў мінулым стагоддзі працаваў у Беластоцкім драмтэатры, а пасля ў Старым тэатры ў Кракаве — да апошніх дзён свайго жыцця. Пані Эва прыехала да мяне з Галяй Тапалянскай з Трасцянкі. Бароўцы пастаянна на летні час бралі водпуск і прыязджалі адпачываць у Трасцянку, дзе здымалі кватэру ў Анастассі Паўлючук, непадалёк Галінай хаты. Спадарства Бароўцы цікавіліся беларускай культурай і абычаямі. Галя — настаўніца-пенсіянерка — вучыла іх беларускай мове. Падарыў быў і я спадарству Бароўцам сваю кніжку, выдадзеную „Нівай" у 2007 годзе — „З нарваўскага боку", за што яны былі вельмі ўдзячнымі.

Спадарыня Эва прыязджае цяпер штогод у Трасцянку, забіраючы з сабой братаву дачку, і надалей вывучае беларускую мову і культуру. Калі сустракаецца са мною, просіць, каб я гутарыў з ёю па-беларуску або на гаворцы. Жадаю пані Эве добрага здароўя, шчаслівага жыцця і далейшых прыездаў у нашае старонне. А Галі Тапалянскай — каб мела больш такіх вучняў і ніколі не забывала дарогі ў маю хату!

**Мікалай ЛУК'ЯНЮК**

Гайнаўка

## Дрэнна, калі няма раскладаў!

У Гайнаўцы аўтобусы гарадскога транспарту ездзяць па двух маршрутах. На некаторых аўтобусных прыпынках стаяць дашкі і ёсць прымацаваныя да сценак актуальныя расклады язды. Аднак не ўсюды ёсць расклады. Няма іх, між іншым, на лініі „1" па вуліцы Простай побач скрыжавання з вул. Тарговай ды на лініі „2" па вуліцы Ліпавай каля ўчастковых агародчыкаў.

Гайнаўскае прадпрыемства гарадскога транспарту павінна ведаць і паклапаціцца пра расклады. Яны — неабходныя. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Агнія і Павел БАРТО

## Дзяўчынка чарнамазая

— Ах, дзяўчынка
Чарнамазая,
Дзе ж ты ручкі
Перамазала?
На далоньках
Плямы,
На локцях —
Таксама.
— Я на сонейку
Ляжала,
Рукі дагары
Трымала,
Вось яны і загарэлі!
— Ах, дзяўчынка
Чарнамазая,
Дзе ж ты твар свой
Перамазала?
Чорны кончык носа,
На шчоках палосы.
— Я на сонейку
Ляжала,
Носік дагары
Трымала,
Вось ён і загарэў.
— Ах, дзяўчынка
Чарнамазая,
Дзе ж ты пяткі
Перамазала?
— Я на сонейку
Ляжала,
Пяткі дагары
трымала,
Вось яны і загарэлі!
— Ой, ці праўда гэта?
Ці так ты рабіла?
Да кроплі ўсё адмыем.
Падавайце мыла!
Мы яе адшаруем.
Закрычала на ўсю глотку,
Як убачыла
Вяхотку.
Як кошка, упіралася —
Мыць рукі
Не давалася.
— Яны не будуць белыя:
Яны ўсе загарэлыя!
Шаравалі тукай нос —
Раскрычалася да слёз:
— Ой, мой бедны носік
Мыла не выносіць!
Ён не будзе белы:
Ён жа загарэлы!
А нос таксама адмыўся.
— Вой, навошта пяткі церці?!
Можна з козыту памерці!
Не будуць пяткі белыя:
Яны ўсе загарэлыя!
А пяткі таксама адмыліся.
Вось цяпер ты белая,
Зусім незагарэлая.
Гэта ўсё быў бруд.

## Да беларускасці праз танец....

Я ўжо другі год танцую ў беларускім школьным танцавальным гуртку „Світанак". Пачаткі былі цяжкія, я не хацела хадзіць на танцы, а бацькі мяне намаўлялі. У канцы канцоў бацькі мяне пераканалі і я пайшла на першыя заняткі. З першых заняткаў я вярнулася нават задаволенай, зацікавілі мяне беларускія народныя танцы. Яшчэ цікавей стала, калі на чарговых занятках мы атрымалі беларускія народныя строі, шытыя спецыяльна для нас у Мінску. Яны нават цяжкія, але выглядаюць цудоўна. Прыгожа выглядае каляровая спадніца-саян, белая вышываная кашуля, перавязаная цікавым поясам, і чырвоны чапец. Нам прыемна, калі гледачы захапляюцца не толькі нашымі танцамі, але і нашымі строямі.

Пэўна таму, што спадабаліся мне беларускія народныя танцы і ўзоры на народных строях, я пачала раптам шырэй цікавіцца беларускай культурай, культурай маіх продкаў. Я ўбачыла, што беларуская культура вельмі цікавая і мае багатую гісторыю. Хутка зразумела таксама, што гэта не толькі культура маіх продкаў, але і мая культура.

Мяне пачала цікавіць і Беларусь, яе багатая, але і вельмі складаная гісторыя. Штораз часцей я чытала на гэтую тэму артыкулы ў кніжках і інтэрнэце, размаўляла з настаўніцай беларускай мовы. Пачала я яшчэ з большай ахвотай вучыцца новым танцам.

Многія мае сябры лічаць, што беларускія народныя танцы гэта „правал". Яны смяюцца і гавораць, што гэта ніякая цяжкасць — навучыцца танцаваць. Яны проста не ведаюць, як цяжка вывучыць усе фігуры танцаў і весці сябе адпаведна на сцэне. Мяне цяпер іх погляды не цікавяць, яшчэ нядаўна я сама так думала і бачу, як памылялася. Цяпер я ганаруся тым, што танцую ў „Світанку".

Гэта перад усім заслуга маіх бацькоў, настаўніцы і беларускай культуры. Я ім за гэта вельмі ўдзячная. Дзякуючы ім, магу прадстаўляць маю школу на розных мерапрыемствах у такой цудоўнай галіне мастацтва, якой з'яўляецца народны танец. Маёй марай ёсць наведаць Беларусь і там паказаць нашыя танцы.

**Моніка Гвоздзей**

Комплекс школ з дадатковым вывучэннем беларускай мовы імя Я. Кастыцэвіча ў Бельску Падляшскім, **вылучэнне** ў намінацыі „Літаратурна-паэтычны твор" (13-15 гадоў) агульнапольскага дзіцячага конкурсу ладжанага Культурным цэнтрам Беларусі пры Пасольстве РБ у Польшчы

### Жывінкі з глыбінкі (2)

Міра ЛУКША

## Бегемот з Гамотаў

**Бегемоту трэба боты.
На ўсе чатыры ногі.
Як паехаў ён у Гамоты,
дык празяб у іх, нябога.
Чобаты дай бегемоту!
Ці калошы пад валёнкі.
Каб у зябу ці ў слоту
цёпла меў ён у галёнкі.
А які памерам боцік?
У каленцы, лытцы, пятцы?..
Не маленькі ж бегемоцік!
Па калошы — сорак пятцы!**

*(аўстралійская казка)*

# Сляпая сіла і розум дзіцяці

Даўно-даўно жыў у Аўстраліі бясстрашны ваяр Нурундэрэ, які не баяўся ні людзей, ні звяроў, ні агню, ні вады. Ён перабягаў цераз лугі ў агні і пераплываў узбураныя рэкі, ганяўся навыперадкі з кенгуру ды шпурляў бумерангам як ніхто на свеце. А калі таптаў зямлю нагой, яна пакорна расступалася і адкрывала золата. Многія зайзросцілі Нурундэрэ, а найбольш Вялікая Рака. Калі ваяр набліжаўся да яе берагоў, Рака чарнела і ўздымала хвалі. Яе пагрозлівы голас наклікаў мёртвую ціш у наваколлі:

— Сцеражыся мяне, Нурундэрэ! — грымела Рака. — Ты першы чалавек, які нарываецца пазмагацца з маёй сілай. Сцеражыся, браток!

— У мяне дастаткова сілы, каб цябе перамагчы, — адказаў ёй Нурундэрэ.

— Глядзі, каб не прагаварыўся, — прасіпела Рака.

— Лепш памірыся з Ракой, — асцерагалі ваяра птушкі, — яна не даруе сваёй крыўдзе!

Але Нурундэрэ махнуў рукой на перасцярогі птушак.

Аднойчы Ваанго, жонка Нурундэрэ, захацела злавіць самага прыгожага матылька для іх сынка. Яна выправілася ў лес, каб сярод рою выглядзець матылька з вясёлкавымі крыламі. На жаль, матыль не даваўся ў рукі прыгожай Ваанго. Жанчына ляцела аж апынулася на беразе Вялікай Ракі. Матылёк, быццам для смеху, зноў адляцеў на некалькі крокаў.

— Шкада, каб уцёк такі чароўны матылёк, — падумала Ваанго і ступіла ў Раку. Пасля яшчэ адзін крок, другі, трэці. Пакуль не агледзелася як папала ў смяртэльную засаду. Успененыя хвалі ахінулі яе з усіх бакоў.

Фота Міры ЛУКШЫ

— Папаўся жучку ў панскую ручку, — зарагатала Рака. — Ну, цікава, ці Нурундэрэ цябе абароніць?!

Ваанго пакорна схіліла галаву і заплакала. Неўзабаве з'явіўся Нурундэрэ і іх сынок. Ваяр кінуўся ў хвалі ратаваць жонку. Але вада гуляла з ім у жмуркі, не дапускала да Ваанго:

— Ну, пакажы які ты моцны!

— Лепш загіну, а не зміруся з табой!

Нурундэрэ доўга калаціўся сярод хваль і нічога не мог зрабіць...

Раптам, сярод успененых хваль пачуўся пранізлівы дзіцячы плач.

— Магутная Рака! Я нідзе не сустрэў дужэйшай і ўсёмагучай за цябе Пані. Ты адна можаш вярнуць мне матулю! Ты адна можаш дапамагчы маёй сямейцы!

Раптам запанавала мёртвая ціш. Звяры, птушкі і матылькі здзіўляліся адвазе хлопчыка, які асмеліўся гаварыць з Вялікай Ракой.

— Вядома, у мяне хопіць сілы, каб вызваліць тваю матулю, — адазвалася пасля красамоўнай паўзы Рака. — Я люблю, калі мяне паважаюць і пачалавечы просяць. Адпушчу таксама твайго бацьку, калі ў яго такі разумны сынок.

Праз момант сямейка стаяла ўжо ля берага Вялікай Ракі. Над іх галовамі кружылі каляровыя матылькі, каб славіць розум і адвагу хлапчука, які спыніў бессэнсоўную вайну паміж яго бацькам і Вялікай Ракой.

# Музыка з кайфам

## Спорт і музыка

Сёння без музыкі не існуе ні фільм, ні рэклама. Сваю музычную апрацоўку маюць усе тэле- і радыёпраграмы. Музычную апрацоўку спектаклю таксама чуем. Жывем у карціннай культуры, дзе найбольш прыцягальнымі з'яўляюцца вобразы, аднак тэлебачанне і інтэрнэт ды іх прапагандысты напамінаюць нам, што ўсюды акружаюць нас гукі. А як гучна бывае на футбольным стадыёне ведаюць тыя, хто хаця б раз пабываў на матчы. Пры чым тут спорт? А вось таму, што ён без музыкі становіцца менш атракцыйным. Цяпер цяжка ўявіць сабе чэмпіянаты і алімпіяды без музыкантаў. Кожны міжнародны матч пачынаецца з нацыянальных гімнаў. Песні балельшчыкаў гэта ўжо традыцыя. Сёння, апрача прыпеваў і шматлікіх гімнікаў, па заказе клубаў узнікаюць афіцыйныя песні і гімны, якіх аўтары — асобы невыпадковыя. Напрыклад, гімн хакейнага клуба „Дынама" Мінск напісалі супольна Алесь Камоцкі і гурт „Палац". Супольнымі сіламі стварылі яны вельмі беларускую, нават народную ў сваім гучанні песню, якая будзе славіць вядомую беларускую каманду. Калі прыглядзецца іншым беларускім клубам, то акажацца, што, напрыклад, словы гімна каманды „Шахцёр" з Салігорска напісаў Раман Арлоў, тады яшчэ гітарыст гурту „J:mors", а цяпер лідар „Ў нескладовага", прыватна сын пісьменніка Уладзіміра Арлова. Надта папулярны апошнімі гадамі „Ляпіс Трубяцкой" таксама мае за сабою футбольны вопыт. Гурт напісаў гімн клуба „Дынама" Мінск. Стадыённыя фанаты пэўна ведаюць гурт „Заточка", які, хаця не напісаў ніякага афіцыйнага гімна, затое іх песня „Хуліганы" выклікала шмат дыскусій.

На польскім баку мяжы многія музыкі таксама шукаюць футбольных балельшчыкаў, якія сталі б фанатамі іхняй творчасці. Можна сказаць, што ловяць хвалю. Так зрабіў, напрыклад, гурт „Wilki", хуткай папулярнасцю спакусіліся маладыя музыкі міхалоўскіх гуртоў „Overday" і „Schody", пішучы на працягу пару гадзін песню пасля таго, як беластоцкі клуб „Ягелонія" стаў пераможцам „Кубка Польшчы". Для адных спорт гэта выклік, для іншых, папулярнасць, грошы, а можа звычайнае задавальненне? А МОЖА ХТОСЬЦІ З ВАС СПАКУСІЦЦА НАПІСАЦЬ ГІМН „ЗОРКІ" ЦІ ТЫДНЁВІКА „НІВА"?

**i_basovka@o2.pl**

http://udf.by

# Польска-беларуская крыжаванка № 38

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 34:

Курс, народ, кот, сала, трава-меч, атака, твар, мурава, агарод. Брама, сук, рот, страва, атава, вараг, паясок, раман, поле, но, дачка.

Узнагароду, аўтаручку, выйграў **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



## Беластоцкі край

Мой Беластоцкі край
— мая Айчына!
З табою звязаны мой лёс і доля.
Люблю лясы твае, люблю даліны,
Кахаю шчыра бацькаўскае поле.

Калышашся ў напевах
песні роднай,
І мыеш твар у промнях залацістых,
І толькі тут я поўнасцю свабодны,
І толькі тут душой заўсёды чысты.

Сямятычы і Гайнаўка,
і Бельск старынны,
Саколка ціхая, зялёная Дуброва,
Любоў да вас
— мая адвечная павіннасць
І вернасць матчынай
спрадвечнай мове.

Шасціць калоссе ў палях шырокіх,
Бурліць крыніца песняю адвечнай,
Звініць нядзельны звон
з царквы далёкай,
На роднай Беласточчыне я вечны.

Зямля мая, мой беларускі краю,
Над Нарваю,
над Бугам задуменным
Я вольны тут, душой адпачываю,
Мой краю вечны,
краю незаменны.

**Алесь БАРСКІ**

* * *

## Смыком па сэрцы

**Выпускнікам бельскага ліцэя**

Навошта ў чалавеку струны існуюць? Закрані абы-якую — гул ідзе. Вясёлую — і рогат півам пеніцца. А калі сумную — кіпцюры па сэрцы заскрабуць.

Бо дзе той Бельск? Ёсць іншыя ліцэі, славутыя, у гісторыю ўбітымі цвікамі. А я да вас імкнуся, хлопцы і дзяўчаты. На вашай ноце думкі мне пяюць — спеўку матчыную.

Бо не ўдалося піць мне з тых крыніц, дзе кожны дзень купаллем іскрыцца, дзе летні вечар коласам шуміць, дзе ловіш прагна кожны гук, каб не забыцца — хто ты.

І злосць бярэ, і ціснеш у руках паперу, і шчыміць нешта болем пад грудзьмі, і марыш — вось, каб двойку хто паставіў за мову родную, сярод сваіх, у сям'і.

А вас ужо грамада. Шарэнгі ў свет пайшлі, каб долю зваяваць. Сярод бландзінаў, рыжых і чарнявых ніводнага, здаецца, не пазнаць.

І струна брэнкнула. І вось зазыў сваячы вас склікаў у той скромны родны кут.

І цяжка мне. Хацелася б быць з вамі. Штодзённай муці плёснуцца ў стругу той плыні беларускай.

Гаворкай роднаю заліць тугу.

**Юрка ГЕНІЮШ**

* * *

Пяройдуць
мо спаткаю зноў
мае лёгкія
спевы паўсонцаў
і вярнуся весялей
каб разменьваць
дробныя
на
дробныя
глебы ростаў

**Марыля БАЗЫЛЮК**

# Словы пра БЕЛЬСК

**Міра ЛУКША**

*Матуральны экзамен па беларускай мове (канец 1960-х гадоў). Злева: Зінаіда Красоўская — настаўніца беларускай мовы, Мікола Гайдук — дырэктар Бельскага беларускага ліцэя, Таіса Бялецкая — настаўніца гісторыі*

Юрка Геніюш невыпадкова напісаў гэты паэтычны апафеоз Бельскага ліцэя: сямёра з аўтараў (Віктар Швед, Дзмітры Шатыловіч, Ян Чыквін, Уладзімір Гайдук, Надзея Артымовіч, Міхась Шаховіч, Юрый Баена) былі бельскімі ліцэістамі, а Мікола Гайдук працаваў тут настаўнікам. Сапраўдная грамада! Яна і папоўнілася наступнымі імёнамі. Кожны, хто браўся за пяро як паэт ці карэспандэнт, дасылаў свае творы ў рэдакцыю газеты беларусаў у Польшчы. А так пісаў у „Ніву" Яўген Семянюк, цяпер архітэктар (Ніва" № 35, 2 верасня 1973 г., „Парнасік"): *Гэй, Гайнаўка і Міхалова! Чаму вы з Бельска не ўзялі прыкладу сабе ў дарогу? Тут сярод вучняў адны паэты, у школе іх каля ста, усе пішуць вершы-цацкі. У „Белавежы" іх таксама цьма. Пазнаць адразу — запал паэтыцкі...* І ў адказ Ніне Матысюк з гайнаўскага белліцэя інфармаваў: *„Ніву" здаўна я чытаю, кожны нумар. Дзве „Нівы" я маю: рана ў пятніцу купляю, а ў суботу ў школе атрымаю. Добра знаю я паэтаў, што ў „Ніву" пішуць" не раз першы, не звычайна, як суседзяў, а па словах, строфах вершаў. Ты гаворыш, біялогаў, матэматыкаў у вас многа. У нас таксама іх нямала — у алімпіядах не бракавала. Трэба быць усебаковым — і спартсменам, і вучоным, і вясёлым, і паэтам! І кажу ў вершы гэтым: маладыя, прабудзіцесь, за пяро рукой вазьміцесь!* (4.11.1973). Так што інфармацыя пра жыццё школы ў Бельску-Падляшскім, якая пачала дзейнасць у 1944 г. як чатырохгадовая беларуская гімназія і двухгадовы беларускі ліцэй (першыя абітурыенты паявіліся ў 1952 годзе), даходзіла да чытачоў ад самога пачатку існавання тыднёвіка. Віктар Швед быў адным з першых тых, хто прайшоўшы муры беларускай школы ў Бельску, выказаў у 1957 годзе на старонках „Нівы" важкія не толькі для сябе словы: „Я — беларус". І хоць у сваім вершы на чарговы з'езд з немалой горыччу гаворыць пра тысячы беларусаў, якія расплыліся ў асіміляцыйным моры, наступныя пакаленні вывучаюць родную мову па яго вершах.

Дзмірый Шатыловіч так успамінае першы час ліцэя: „У 1946 г. у Беларускай гімназіі і ліцэі было 11 класаў, у якіх вучылася каля 300 вучняў. У маі 1945 г. вучні 2 класа ліцэя і ўсе чацвёртыя класы гімназіі і наш семестравы пачалі здаваць экзамены, першыя на атэстат сталасці, а другія на малы атэстат сталасці (duża i mała matura). У маі 1946 г. у ліцэі атэстат сталасці атрымала 12 вучняў, а на малы атэстат сталасці здало экзамены 80 вучняў. Многія вучні з нашага класа пасля атрымання малога атэстату сталасці пачалі думаць, дзе далей маюць ісці вучыцца. Знаю, што Кадлубоўскі, Мікша, Сабалеўскі рашылі паехаць у Лодзь у ваенную фельчарскую школу і мне туды ісці прапанавалі, але мая матка і сястра не згадзіліся і я разам з Антонам і Мікалаем пастанавіў ісці ў Беларускі ліцэй. Віктар Швед паехаў у Варшаву на падрыхтовачныя курсы на вышэйшую навучальную ўстанову... У кожную суботу я з Антонам і Мікалаем вечарам ездзіў цягнікам на станцыю Чаромху і мы пяшком ішлі да вёскі Чаромхі, набіралі ежу на цэлы тыдзень, і ў нядзелю вярталіся ізноў у Бельск-Падляшскі на нашу кватэру па вуліцы Дубічы".

Не ўсе вучні, якія праявілі літаратурны талент, да канца змаглі вучыцца ў ліцэі, перш за ўсё з-за нястач у сям'і, як Валодзя Гайдук ці Сцёпа Карбоўскі (аднакласнікі Янкі Чыквіна; матура ў 1959 г.). Ды да гэтай пары іх радкі — паэтычныя і празатарскія — не пакінулі роднай палоскі. „Ніва" пад дасведчанай рукой галоўнага рэдактара Г. Валкавыцкага прыгортвала на свае літаратурныя старонкі першыя кветачкі. Моладзь, сарамліва выдумлівала псеўданімы, часам вельмі адмысловыя, як „Артур Амураў" — Янка Чыквін, цяперашні прафесар-літуратуразнавец і паэт. Ян Чыквін яшчэ як ліцэіст апынуўся сярод заснавальнікаў Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", якога з'яўляецца шматгадовым старшынёй і выдаўцом літаратурна-крытычнага часопіса „Тэрмапілы". І хоць у сваім вершы галосіць *Я вель-*

радзімы раніцай
распятай йосіпам пілатам
я абмываю хрупкі сон дзяцей
каб не прысніўся ім ягоны цень
і жар хатыні
жар гарэўшых хатаў
адкуль
астыўшую слязу
расплаўленай
падковы
я забяру на страшны суд
там ветрам слоў расчэсану расу
рассыплю я на роднай мове
пра Беларусь
абдзёртую з вякоў у спальні з тронам
на чарнобыля крыжы распяту
з душой замучанай у курапатах
харонену трохмоўным звонам
каб уваскрэсла
светлым
раннем
з чараю мінулага ў далонях
і грохкатам капыт
святой
пагоні
абвесціла сваё вяртанне

**Віктар СТАХВЮК**

* * *

*Сп.праф. Галіне і Яну Ч.*

Бацькоўскімі рукамі
Матчынай спагадай
Крылом дрыгавічоўскім
Вы прыгарнулі да сябе
Маладых белых коней
Яны мчаць па беларускім полі
Пагоняй змагання
Да крыніцы роднае мовы.

**Юрка БУЙНЮК**

* * *

Няхай будзе блаславёны дзень
калі цябе пазнала
Няхай будзе блаславёнае месца
дзе цябе спкаткала
Няхай будуць блаславёныя людзі
якія аб твабе гаварылі
Няхай будуць блаславёныя бацькі
якія цябе нарадзілі
Блаславі Божа таго
хто выклікаў ува мне святую пакуту

**Ірына СВЕНТАХОЎСКАЯ**

* * *

Зямлю абдымаю вачыма.
Тулюсь, нібы да дзяўчыны.
Шапчу:
— Дарагая, скажы,
Чаму я жыву на мяжы?
Чаму я заўжды вінаваты?
Чаму чужынцы спаганьваюць хату?
Скажы,
Дарагая, як жыць?
У родным доме выгнаннікам быць?
Чаму на бяскрэссі прастораў
У хаце маёй аж цесна ад гора?
Скажы,
Дарагая, скажы.
Ці доўга мне жыць на мяжы?

**Міхась ШАХОВІЧ**

## Дом Дзядулі

брамка адкрыта
на кагосьці чакае
аднак і так ніхто сюды не прыйдзе
усё ў траве
— чыёй рукой засеянаю
замкнёны вокны і дзверы
сцеражэ павуцінне
перад дзённым святлом

мінулае — быццам белыя
кветкі вясны
на замёрзлай шыбе

**Юстына КАРАЛЬКО**

## А дом наш недзе

Вечарам духмяныя ўстаюць агароды,
Бярозы рукі апускаюць у крыніцы,
Чаромхі ўецца неслухмяны водар,
Як віно, якога нельга ўжо напіцца.
І галасы сяброў, і клёкат бусла з клуні,
І лугі, дзе конскія пасуцца грывы,
І сон глыбокі ветру у палудзень,
І трава іржавая па-над абрывам.
У садзе зноў цвітуць кусты язміну,
Макі грэюць рукі, узняўшыся высока.
А дом наш, як далёкія ўспаміны...
Без дзвярэй, без тынку і без вокан.

**Ян ЧЫКВІН**

* * *

І зноў я ў роднай вёсцы
З сям'ёю, між знаёмых.
Штодзень бываю госцем
На радасных прыёмах.

Усюды запрашаюць
Мяне з адкрытым сэрцам,
І часам адчуваю
Сябе, як на канцэрце.

Далёкія ўспаміны
Спатканні папаўняюць
Пра нашы каляіны
Да пекла і да раю.

Пра дзіўныя забавы,
Пра даўнія хваробы,
Пра подзвігі без славы,
Пра акіяны злобы.

І кожны раз трымаю
Экзамен з роднай мовы,
Які мяне трывожыць
Ва ўсіх маіх размовах.

На мове той у вёсцы
Гаворыцца заўсёды,
Яе не зменіць мода,
Яе не зменяць годы.

І ёй не здрадзяць людзі
У гэтым асяроддзі,
Я веру, што жыць будзе
Праз доўгія стагоддзі!

**Дзмітрый ШАТЫЛОВІЧ**

## Мы без народа, роднай мовы

*Удзедьнікам IV З'езда выпускнікоў і выхаванцаў Бельскага беларускага ліцэя імя Браніслава Тарашкевіча*

Мінула ўжо і паўстагоддзя
Нашага роднага ліцэя.
Ды хто ж нас ведае ў народзе,
Якою мы жывем ідэяй?

Нас болей тысяч трох па ліку,
Даўняе моладзі вясковай.
А хто ж з нас з колькасці вялікай
Не пагарджае роднай мовай?

Мы ўжо ў асноўным не нацмены,
Гэта даўно ў нас выйшла з моды.
Мы з роднае сышлі арэны,
Зракліся мовы і народа.

Мы не чытаем роднай „Нівы",
Бо на чужым мы возе едзем.
З нас кожны сапраўды шчаслівы,
Што не кранаюць нас суседзі.

Кажуць заўжды: народа сіла
У інтэлігенцыі ягонай.
Таму й народ наш такі хілы —
Ён без падтрымкі, абароны.

Святкуем сёння мы паўвека
Як быццам беларускай школы,
Нацыянальныя калекі.
Далейшы лёс наш невясёлы.

**Віктар ШВЕД**

*16 мая 1994 года*

Ян ЧЫКВІН

Юрый БАЕНА

*мі самотны, айчыны не маю,* уся дзейнасць яго, і яго калег па пяру, таксама і выхаванцаў бельскага белліцэя, сведчыць аб тым, што тая айчына, і мова, існуюць не толькі ў іх сэрцы. Нядаўныя дэбютанты складваюць кнігі, нядаўнія вучні — становяцца настаўнікамі наступных пакаленняў. Дырэктарам стаў Андрэй Сцепанюк (матура ў 1982 г.). У словах паэтаў явіцца і існуе Бельск-сталіца мікрасусвету. *Я забываю што // у дзень майго нараджэння // на шпіталь // у Бельску- Падляшскім // мелася ўпасці // атамная бомба.* Іх словы станавіліся песнямі-гімнамі, як верш прысвечаны Алесю Гаруну. Іншым настаўнікам, ужо не філолагам, быў Юрый Баена (матура ў 1976г. ). Ён і заклікаў: *Мы, // маладыя беларусы, // ідзем наперад* — гэта ў першых творах аўтара шмат тамоў лірыкі, а пасля ла-

Надзея АРТЫМОВІЧ

подарным словам тлумачыць ён сэнс нашага тут рыфмарства: *Недапетую песню — даспявай. // Недазбіранае — дазбірай. // Несказанае да канца — скажы... // Толькі думак сваіх — не тушы.// Веру жывым — перадай.* Некаторыя лірыкі больш слова не скажуць чым сказалі, маладымі, перадаючы іх сваім наступнікам: Міхась Шаховіч (матура ў 1972 г.), Марыля Базылюк (матура ў 1978 г.), Люся (Людміла) Анхім (матура ў 1985). Ёсць аўтары, якія сказалі хоць толькі пару слоў, але яны засталіся на старонках"Нівы", як Марынка Аліхвер са Старога Ляўкова, якой верш „Пеўні" друкаваўся і ў альманаху „Букет Белавежжа", куды трапілі найтрапнейшыя словы нашых беластоцкіх паэтаў. Разважала Марынка яшчэ ў школьных мурах, што праз міг гэтага не будзе, а ўсё *Прамінанне*: *і мае тут з мінулым размовы.* Прамільгнула і Ірэна Свентахоўская (матура ў 1971 г.): З*находжуся між вамі //... Я адышла // каб думкамі вярнуцца.* Пару слоў паэтычных і празатарскіх склала і Паўліна Шафран (матура 1999), цяпер пагранічніца. Юрка Буйнюк (матура 2000 г.) таксама ў сваім вершы „Спадчына" балюча адчувае час, гісторыю, як радзінную, так і нашу агульную: *Вечны час заклі-*

*нае гісторыю // Дзед пакінуў па сабе кошыкі // Мы носім у іх бульбу // Яны жывуць // Бабуля пакінула па сабе // Хату з сасновага дрэва // Яна ўзгадавала бацьку і нас...* Юрку, як і іншым паэтам, не трэба ісці шляхам шматмоўнасці, каб сказаць праўду. Хай і нека-

Марыля БАЗЫЛЮК

торыя з гадаванцаў бельскага ліцэя аддалі свой талент украінскай плыні літаратуры (Юрка Гаўрылюк — матура ў 1983 г. ці Жэня Жабінская — матура ў 1984 г.). Іншыя, Як Віктар Стахвюк (матура ў 1966 г.), становяцца таксама збіральнікамі родных песень, мастакамі, і не толькі на літаратурнай мове спяваюць Радзіме: *каб уваскрэсла ў цемры светлым раннем //...// і грукатам капыт святой Пагоні // абвесціла сваё вяртанне.*

Юры ГАЎРЫЛЮК

За Віктарам Шведам схочам у родны Бельск, *туды, дзе буду родны ўсім,* у месца духу апетае Надзеяй Артымовіч (матура ў 1964 г.), у той *горад маленькі, маленькі, як кропля дажджу (...)* які *не расплывецца ніколі (...)*, дзе *вузкія вуліцы поўныя людзей // людзей старых // і дзяцей.* Бо *дрэва без кораня // усыхае // чалавек без паветра // памірае.*

Надзея ў Бельску: *Глыбока ў зямлі // ляжаць першыя і апошнія словы.*

Надзея ў новых словах, новых вучнях беларускай школы.

## Вера

*На сотую гадавіну з дня нараджэння Алеся Гаруна*

Не плач, Айчына,
вялікі Бог
магіл тваіх
палечыць раны
і зноў на твой
святы парог
прыйдуць Алесі
Цішкі
і Іваны
А ты як маці
прыймеш іх
і зноў абнімеш
сваім лонам
яны з крывавах
горкіх слёз
дадуць жыццё
тваім загонам
І будзе свята
будзе баль
зноў кліч Пагоні
дзесь над намі
няхай жыве
наш карнавал
наш беларускі
пад сцягамі
Няхай у свет
ляціць прывет
усім народам
у свабодзе
ад шчырай
нашае душы
заўсёды будзем
жыць у згодзе
Айчына маці
яшчэ раз
крыжоў тваіх
пражыць не хочу
таму з прысягай
на губах
сто раз цалую
твае вочы

**Андрэй СЦЕПАНЮК**

* * *

Пад тваю абарону іду,
слова першае,
беларускае, пісанае ў кнігах
і няпісанае.
Гонар ты мой,
кветка лілея,
скарбніца вякоў
і надзея.
Слова роднае,
неўміручае,
ты, як сцяг
у снягах.
Вакол завея.

## Родным

Сцеражыце ўспаміны
— яны ваша памяць.
Не бойцеся ветру, ідзіце ў замець.
Спяшайце на абарону
матчынай мовы,
Якая прылашчыць у вечар зімовы.
З вокнаў дзяцінства гляньце
на дарогу:
Мо хтосьці за вамі падыходзіць
к парогу?
Будзьце сябрамі, будуйце згоду,
Каб жыццё стала годным.
У найвялікшай пашане
Сустракайце родных!

**Юрый БАЕНА**

* * *

Над Бельскам шэрае неба
шэры брук шэры
парог забыты музык
на шэрым парозе
Бельск
мястэчка памежжа мястэчка
бязмежжа
на шэрым парозе
стары музык
заснуў

**Надзея АРТЫМОВІЧ**

# Зянон Пазьняк у Літве

*28 жніўня на традыцыйнай імпрэзе ў Таварыстве беларускай культуры ў Літве прысутнічаў Зянон Пазьняк. Сама ж імпрэза была прысвечана сотым угодкам з дня нараджэння самай вялікай беларускі XX стагоддзя — Ларысы Геніюш.*

Выступленне распачаў старшыня ТБК Хведар Нюнька, які коратка распавёў пра гераічную жанчыну і святкаванне яе стогадовага юбілею ў Зэльве 7-8 жніўня 2010 г. Як зазначыў старшыня ТБК, на святкаванне прыехала шмат людзей з розных куткоў Беларусі. Мясцовыя ўлады не чакалі такой колькасці людзей, таму нават не ведалі што і рабіць. А калі б прыйшло чалавек 20-30, іх, хутчэй за ўсё, арыштавалі б. Сумным быў той факт, што ўлады сарвалі шыльду ў гонар Ларысы Геніюш. Але такі варыянт быў прадугледжаны і мелася копія шыльды, якая і была прымацавана ў часе святкаванняў. Такім чынам, стогадовы юбілей самай вялікай беларускі ў незалежнай Беларусі праводзіўся паўлегальна, амаль што забаронена.

У другой частцы праграмы быў паказаны відэафільм пра тых, хто стаяў ля вытокаў беларускага адраджэння ў савецкай Беларусі і дзякуючы каму адбылося яе адраджэнне ў канцы 1980-х гг. Кожны з іх рабіў сваю маленькую справу. Але якраз гэта і перазахавала Беларусь, стварыла глебу для яе нацыянальнага адраджэння. На экране былі партрэты гэтых людзей, якіх не скарыў рэжым, якія не спалохаліся рэпрэсій і захавалі веру ў вольную і незалежную Беларусь. Ці было б магчымым адраджэнне ў 1980-х гадах у тых маштабах, у якіх яно адбылося, калі б не было самаахвярнай працы гэтых людзей?

Па заканчэнні прагляду стужкі перад аўдыторыяй выступіў Зянон Пазьняк. Гэтым разам ён засяродзіўся на асобе Ларысы Геніюш. У сціслай форме распавёў аб асабістых з ёю сустрэчах і сваіх уражаннях ад іх. Сустрэч з ёй было толькі тры. Першая — калі пазнаёміліся і яны прагаварылі разам усю ноч, другая — калі памёр яе муж, і трэцяя — калі яна была ўжо ў труне. Спадар Зянон не адзін раз падкрэсліваў моц духу гэтае жанчыны, яе інтэлігентнасць, нескаронасць і нязломнасць. Нягледзячы на ўсе пакуты і праследаванні рэжыму, яна не скарылася, не зламалася, а галоўнае — не ўзлавалася. Яна заўжды стаяла вышэй за сістэму. Пішучы пра лагер, яна не апускалася да ўзроўню зэкаўскага жаргону, толькі пісала вельмі лагодна, інтэлігентна.

Менавіта такія асобы, працягваў далей Зянон Пазьняк, і гартуюць нацыю, захоўваюць яе, робяць культурнай. У шматлікіх лагерах ведалі Ларысу Геніюш як нязломную беларуску, высокаінтэлігентную і шанавалі, незалежна ад нацыянальнасці. Яе вершы падтрымлівалі духам вязняў ГУЛАГу розных нацыянальнасцей і поглядаў. Яны таемна перадаваліся, чыталіся і былі падтрымкай у тыя журботныя дні.

Далей спадар Зянон адзначыў чалавечнасць асобы Ларысы Геніюш і яе ўменне паважаць іншых людзей незалежна ад поглядаў і веравызнання. Яна не прыняла савецкага грамадзянства і была незалежнай ад гэтай сістэмы, заўжды была аптымістычнай і верыла ў тое, што Беларусь стане незалежнай.

Асаблівую ўвагу Зянон Пазьняк засяродзіў на тым, што дзейнасць такіх людзей, як Ларыса Геніюш, выхоўвала і фармавала беларусаў. Як прыклад, прывёў асобу князя Васіля Святаполка-Мірскага, які толькі ў лагеры, пасля сяброўства з ёю, стаў свядомым беларусам. Менавіта такую працу трэба праводзіць, каб выхоўваць беларусаў. Моцная, нязломная духам, шчырая беларуска.

Пасля выступу, прысутныя ў зале задалі некалькі пытанняў Зянону Пазьняку. У асноўным яны тычыліся сённяшняй палітычнай сітуацыі ў Беларусі і яго бачання разгортвання далейшых палітычных падзей. Пазьняк зазначыў, што спадзявацца на выбары няма сэнсу, бо Лукашэнка іх правядзе „так як трэба" і выйграе (у чым можна не сумнявацца). Таму лічыць, што ўдзел у выбарах не мае ніякага сэнсу. Улада баіцца не таго, як будуць галасаваць, толькі байкоту выбараў, бо вынікі ўсё роўна напішуць такія, як трэба. А асноўныя падзеі ў Беларусі пачнуць разгортвацца пасля выбараў.

Нягледзячы на сённяшнюю сітуацыю, Зянон Пазьняк верыць у адраджэнне Беларусі і ў тое, што яна стане беларускай. Трэба перачакаць гэты зняважлівы час і дачакацца патрэбнага моманту. Такі быў у канцы 1980-х гг., такі будзе і зараз.

Напрыканцы імпрэзы выступіў Раман Кавальчук, які заклікаў беларусаў быць беларусамі. Бо, як ён адзначыў, у Беларусі моладзь вельмі часта забываецца, што яны ў Беларусі і беларусы. І як вынік, на вуліцах Менска вельмі часта пачуеш: „А ў нас в Росіі". Такога не павінна быць.

Пасля моладзь яшчэ доўгі час не разыходзілася, размаўляла з Зянонам Пазьняком, брала ў яго аўтографы і дзялілася з ім сваімі думкамі.

**Алесь АДАМКОВІЧ**

У свеце стала больш на адзін тэлевізійны канал, які тым ці іншым чынам звязаны з беларусамі. Беларуская дыяспара Эстоніі здолела стварыць у інтэрнэце ўласнае тэлебачанне. Канешне, гэта пакуль не тое тэлебачанне, што мы прызвычаіліся бачыць, маючы на ўвазе тэлевізар. Паглядзець АРУ (такую назву мае тэлеканал беларусаў у Эстоніі) можна пакуль толькі па інтэрнэце. Ну а каб гэта зрабіць, трэба выйсці на сайт **http://aru.tv/by.**

Па вялікім рахунку даны сайт на сённяшні дзень з'яўляецца невялікай падборкай разнастайных відэасюжэтаў, якія найперш цікавы тамтэйшай беларускай дыяспары.

Выгляд сайта пакуль даволі просты. Зверху месціцца назва, відэаспасылкі на некаторыя сюжэты, выйсці на некалькі рубрык.

Чамусьці галоўныя для азнаямлення з сайтам выйсці размешчаны ўнізе цэлага выяўлення. „АРУ ТБ — гэта новы арыгінальны інтэрнэт медыя-праект, — прадстаўляюць справу сваіх рук стваральнікі сайта ў тэксце на старонцы „Пра нас". — Мы прапаноўваем уласны разнапланавы кантэнт, праграмы інфармацыйнага, аналітычнага і забаўляльнага характару. Мы працуем на трох мовах: рускай, беларускай і ангельскай. Кола нашых інтарэсаў — гэта краіны постсавецкай прасторы, Еўрапейскі Саюз і ЗША".

Аўтары гэтага інтэрнэт-тэлеканала сцвярджаюць, што асвятляюць палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя падзеі, надаючы павышаную ўвагу культуры і праектам адукацыйнага характару. „На нашым сайце прадстаўленыя інтэрв'ю вядучых экспертаў, вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў. Мы імкнемся быць альтэрнатыўнай крыніцай інфармацыі для ўсіх, у каго няма магчымасці карыстацца незалежнымі СМІ", — гаворыцца далей у невялікай самапрэзентацыі натхняльнікакаў АРУ.

Цікавыя таксама мэты, якія ставяць стваральнікі тэлеканала. Па іх словах, АРУ ТБ створанае як для папулярызацыі еўрапейскіх ліберальных каштоўнасцей у краінах постсавецкай прасторы, асабліва ў Расіі і Беларусі, так і для развянчання міфа аб тым, што Расія і Беларусь — гэта краіны з інертным, не гатовым да дэмакратыі насельніцтвам. Аб гэтым пішацца на старонцы „Пра праект".

На сайце ёсць і рубрыка „Каманда", але даведацца, хто ж непасрэдна займаецца гэтым беларускім тэлебачаннем, немагчыма. Пэўна, беларусы, нават знаходзячыся ў такой дэмакратычнай краіне як Эстонія, не змаглі пазбавіцца сваёй адной з асноўных рыс — жаданні не высоўвацца. І ўвесь расповед ідзе ад нейкіх „мы", мэта якіх — „па-сапраўднаму адзіная Еўропа ад Брэста да Уладзівастока, без аўтарытарызму, планавай эканомікі, з рэальным інстытутам выбараў".

Разам з тым стваральнікі гэтага інтэрнэт-тэлеканала запрашаюць да супрацоўніцтва ўсіх жадаючых, падаючы пры гэтым кантактныя тэлефоны і адрасы электроннай пошты ў рубрыцы „Кантакты".

Што ж тычыцца тых нешматлікіх пакуль сюжэтаў, якія ўжо змешчаны на сайце, то, пэўна, найбольш цікавымі варта адзначыць расповед пра адкрыццё беларускіх класаў у горадзе Кохтла-Ярвэ, размову з мастаком Аляксандрам Шатэрнікам, філосафам Валянцінам Акудовічам.

На сайце пакуль маецца некалькі старонак, такіх як „Інтэрв'ю" ці „Дакументальныя фільмы", дзе няма аніякай інфармацыі. Пэўна, іх запаўненне ў планах стваральнікаў сайта.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

# Беларусь,беларусы...

**Максімум з рэальнага**

Пасля двух тураў адборавага турніру да чэмпіянату Еўропы па футболе турнірная табліца групы „D" выглядае досыць нязвыкла. Яе ўзначальваюць Албанія і Беларусь, якія маюць у актыве па 4 ачкі, далей ідуць Францыя, Боснія і Герцагавіна — па 3, Румынія — 2, Люксембург без пунктаў. Перад хатняй сустрэчай беларусаў з румынамі многія з заўзятараў напэўна спадзяваліся на другую вікторыю і максімальны вынік. Супраць каманды Бернда Штанге была статыстыка дачыненняў дружын, а таксама не лепшы функцыянальны стан каманды пасля ўдалага французскага ваяжа. Трэнер Румыніі Рэзван Лучэску кардынальна абнавіў свае шэрагі пасля асечкі з албанцамі і мы ўбачылі зладжаную камандавую гульню гасцей. Асабліва выразна яны глядзеліся ў адборы. Без перабольшвання можна сказаць, што дасягнутую нічыю 0:0 можна запісаць у актыў беларускай зборнай. А лепшым у яе шэрагах быў брамнік Юры Жаўноў, капітан бездакорна адпрацаваў у брамцы і неаднаразова выратоўваў калектыў. У атацы ў нашых зусім не ладзілася. Тактыка з адным форвардам тараннага тыпу — Сяргеем Карніленкам сябе ніяк не апраўдала, нападнік стараўся, але меў толькі адзін рэальны момант, у самым пачатку, а пазней належнай падтрымкі ад паўабаронцаў не атрымаў. Цэнтральная лінія выглядала ў нас непераканаўча, было відаць, што і Віталь Кутузаў і Аляксандр Глеб не гатовыя фізічна гуляць два матчы запар. Стваральнасці і крэатыву беларуская сярэдняя лінія не выявіла. А тут яшчэ Штанге надзвычай доўга цягнуў з заменамі, ажно пакуль Глеба-старэйшага не траўмавалі. Балазе, што з характарам на гэты раз усё было ў парадку. Таму першае ачко ў афіцыйных сустрэчах з румынамі нашы хлопцы заслужылі. Парадаксальна, але трапіўшы за дзве гульні толькі адзін раз у браму сапернікаў, Беларусь узяла ажно 4 пункты. Гэта быў сапраўды максімум з магчымага. Што далей? Далей вельмі спрыяльны расклад на гэты год. 8 кастрычніка гуляем у гасцях з аўтсайдарам Люксембургам (прыйшла пара браць рэванш за кур'ёзную паразу два гады таму ў Гомелі!), а затым 12 кастрычніка ў Мінску з албанцамі. Пасля чаго наступіць перапынак ажно да вясны. Заданне на бліжэйшыя сустрэчы відавочнае — толькі 6 ачкоў з 6 могуць пацвердзіць сур'ёзнасць амбіцый. У разе ж якой-небудзь страты трэба быць рэалістамі і развітвацца з марай убачыць гэтую каманду ў фінальнай стадыі кантынентальнага форуму. Пакуль бальшыня фактараў і акалічнасцяў склаліся за Беларусь, трэба гэтым карыстацца. Бо напэўна і французы і румыны цягам турніру істотна прыбавяць. Баснякі ж для нас пакуль увогуле загадка.

Што датычыць моладзевай зборнай Беларусі, то яна здолела ўсё ж выйсці ў раўнд плэй-оф. Натужная перамога над Азербайджанам 1:0 (гол на рахунку Паўла Няхайчыка) забяспечыла падначаленым Гергія Кандрацьева другое месца. Сваім парадкам Шатландыя дома ўзяла верх над Аўстрыяй — 2:1. У выніку брытанцы і нашы набралі аднолькавую колькасць ачкоў — па 17, а па асабістых сустрэчах вышэй апынуліся шатландцы. Гэта ўплывала на пасеў пры лёсаванні накаўт-раўнду. Беларусам на гэты раз не пашанцавала — змагацца давядзецца з Італіяй. Сапернік надзвычай цяжкі і шанцаў на выхад у фінальную частку першынства няшмат. З іншага боку, можна цешыцца і дасягнутым, прыкладам Расія і Польшча не здолелі выйсці і ў плэй-оф. Матчы апошняга рубяжа пройдуць у кастрычніку.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# У НІЎСКІМ фотааб'ектыве

## Дарагія Чытачы „Нівы"!

**Калі Вы ў час сваіх шпацыраў, падарожжаў увекавечылі цікавы, прыгожы, гумарыстычны, задумлівы здымак — і не хочаце, каб ён ляжаў у самоце, дык дасылайце нам яго ў рэдакцыю па электроннай, або звычайнай пошце. Калі ласка, падпішыце дзе ён быў зроблены і хто яго аўтар, а мы надрукуем, калі будзе цікавым.** *Рэдакцыя*

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

*Свята*

# *Ушанаванне іконы „Усецарыца" ў Сынковічах*

Сяргей ЧЫГРЫН

У вёсцы Сынковічы Зэльвенскага раёна адбылося вялікае свята. Раніцай 31 жніўня сотні людзей з усёй Беларусі сустракалі каля Свята-Міхайлаўскай царквы копію цудатворнага абраза „Усецарыца" з Афона (Грэцыя), асвячанага ў дваццаці манастырах Афона і прыкладзенага да мошчаў святых угоднікаў Божых. Абраз „Усецарыца", зроблены афонскімі манахамі і асвячаны на Святой Гары. Праваслаўныя святары адзначылі, што афонская ікона „Усецарыца" з'яўляе сваю моц супраць магічных чараў, захапленне якімі распаўсюдзілася па хрысціянскім свеце. Гэтая ікона праславілася рознымі цудамі і вылечвае ад хвароб сучаснай цывілізацыі — анкалогіі, наркаманіі, СНІДу. Ікона, напісаная з выкананнем канонаў і асвячаная на першавобразе, атрымлівае такую ж боскую благадаць і моц, як і арыгінал.

Фота Сяргея ЧЫГРЫНА

Спачатку ікону „Усецарыца" паставілі каля ўвахода ў сынковіцкі храм, каб вернікі маглі памаліцца каля яе і папрасіць дапамогі. А потым „Усецарыцу" ўнеслі ў храм, дзе яна будзе знаходзіцца ўжо пастаянна.

Урачыстае богаслужэнне з нагоды сустрэчы іконы з Афонскай гары ўзначаліў епіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Арцемій.

Гэта ўжо не першы абраз, напісаны афонскімі манахамі і прывезены ў Беларусь. Сёлета ў траўні копію цудатворнай іконы Божай Маці „Скорапаслушніцы", якую напісалі афонскія манахі, прывезлі ў Мінск.

# Адгаданка



1. сукупнасць працэсаў, якія перыядычна паўтараюцца, 2. дэманалагічны гаспадар поля, жытні дзед, 3. геаметрычная фігура, атрыманая ў выніку поўнага абароту прамавугольнага трохвугольніка вакол аднаго з ягоных катэтаў, 4. пабуджальная прычына, 5. прыбор, які мае пункт апоры і служыць для ўраўнаважвання большай сілы пры дапамозе меншай, 6. сталіца Мальдываў, 7. гарадская дарога, 8. паўвостраў у Карскім моры, 9. частка рукі ад запясця да канца пальцаў, 10. трэці гук музычнай гамы, 11. выраст з касцявога рэчыва на чэрапе некаторых жывёл, 12. воін, 13. павальная смерць, 14. успрымальнік арамату і дулі, 15. дрыгва, багністае месца, 16. вучэнне Маркса, 17. наглядчык прыгонных сялян, 18. Ноеў карабель, 19. порт на поўначы Францыі, 20. абшчына веруючых.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з літарай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 33 нумара**

Восень, дата, застой, мода, пах, пітон, Поці, Рона, Рым, хват, чараўніца.

Рашэнне: **Той, хто хоча стаць правадыром народа, павінен ісці за натоўпам.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

# 19.09 — 25.09

**(22.03. — 20.04.)** Неўтаймаваны апетыт на каханне. У выпадку праблем не змагайся дасягнуць свайго і даказаць, што ўсё ж гэта ты меў рацыю. На працы дасканалься і не трапляй у самазадаволенасць. 23.09. пагоршыцца настрой, будзеш нервовы і ахопіць цябе пачуццё, што быццам бы ўсё можаш зрабіць, а паралізуе цябе боязь.

**(21.04. — 21.05.)** Абавязак будзе стаяць на першым месцы. Ды праца прыняце плён. Задбай аб свае косці, суставы, пазваночнік. Пры поўні Месяца (24-25.09.) будзеш раздражнены, вельмі патрабавальны і крытычны.

**(22.05. — 22.06.)** Пачнеш цікавіцца рэчамі і людзьмі, якія да гэтай пары не прыцягвалі тваёй увагі. У пачуццях стабілізацыя. Асоба, з якой супрацоўнічаеш, разбурыць твой спакой (18-22.09.). Перакананне, што маеш абсалютны ўплыў на кожны элемент тваёй працы, будзе тваёй памылкай. Не рабі нічога неабдумана.

**(23.06. — 23.07.)** Твае парады на працы — трапны стрэл у „дзесятку". Але не будзь празмерна шчыры, гаваркі і не лезь са сваімі парадамі і рацыямі. У час поўні (23.09.) будзеш лішне гвалтоўны і пабуджаны; захавай халаднакроўе і не паказвай злосці. З 23.09. (да 27.09.) будзь асабліва асцярожным у выдатках, пазбягай крэдытаў і падазроных гандлёвых прапаноў.

**(24.07. — 23.08.)** Будзе табе моцна хацецца зрабіць штосьці, што на думку іншых не мае шанцаў на рэалізацыю. Не стой заўпарта на сваім і не спрачайся (можаш нарабіць сабе ворагаў). 23.09. адчуеш духовую раўнавагу. З 24.09. (да 28.09.) не давярай завельмі іншым.

**(24.08. — 23.09.)** Да 23.09. з цябе проста б'е фантан энергіі! Адчуеш, што не круцішся ў адным месцы і набярэш ветру ў свае ветразі. 23.09. твае эмоцыі будуць у зеніце, дык будзеш асабліва сварлівы, перш за ўсё ў пары.

**(24.09. — 23.10.)** Усе твае планы зрэалізуеш, не толькі дзякуючы добрым выпадкам, але і свайму стараню. 22-24.09., у час поўні Месяца, будзеш прымушаны вырашыць важную справу; калі не будзеш гатовы, не спяшайся. Тым больш што турбаваць цябе будзе хістанне настрояў: ад эйфарыі — да чорнай роспачы. З 23.09. штораз лепш з тваім здароўем і прызнаннем сярод публікі.

**(24.10. — 22.11.)** Не падвядзе цябе інтуіцыя. Варта кудысьці выбрацца з любымі табе людзьмі. Не пазбягай сямейных сустрэч. Не папраўляй настрою пакупкамі. З 24.09. (да 28.09.) можаш адчуць аслабленне сілы. Часцей выходзь з хаты.

**(23.11. — 22.12.)** Да 21.09. будзеш схільны да эксперыментаў і свабодалюбівасці. Праблемы на працы з-за занядбанняў і непаразуменняў ды пазбягання адказнасці (19-23.09.). Мілая неспадзеўка ў пачуццях — адазвецца асоба, аб якой ты даўно забыўся. Твае поспехі могуць стацца соллю ў воку кагось, хто стаіць вышэй цябе.

**(23.12. — 20.01.)** Будзь сабою, не прытварайся. Пераканаешся аб добрых намерах сваіх знаёмых. Твой недавер да каханай асобы яе раніць. 19-23.09. — можаш падараваць свае пачуцці камусь нявартаму гэтага. 19-23.09. схавай у шуфляду ключыкі да аўто, не плануй падарожжаў!

**(21.01. — 19.02.)** 20-24.09. не ўсё паладзіцца па тваіх планах. Да 23.09. назбіраецца мноства неадкладных спраў, пільнуйся, каб не памыліцца. Абавязкова падумай аб адпачынку, нават калі трэба будзе адмовіцца ад некаторых намераў. Прафесійныя планы ўдадуцца, ды мусіш быць вельмі паслядоўным у дзеяннях.

**(20.02. — 21.03.)** Прыдасца табе сур'ёзны адпачынак. Не бойся цяжкіх размоў з партнёрам. Падумай з ім аб супольных планах. Самотныя Рыбы хай звернуць увагу на Дзеву. 23-27.09. можаш улезці ў клопаты, ад якіх табе лепш трымацца здалёк.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
***Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.***
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.

**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.
**Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
**Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
**Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",**
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945
**Nakład**: 1 000 egz.

# Вяселле ў Беластоку і хаўтуры ў вёсцы

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Кася Дмітрук-Аляксеюк, Надзея Алекша, яе дачка Арыядна і ўнучка Кася

— Даўно ў мяне не было ўжо рэдактараў! — прывітала нас як чаканых гасцей 88-гадовая Надзея Алекша з Піражкоў. Бабуля любіць, калі да яе прыязджаюць людзі. Адразу пасадзіла нас наспураць сябе і без лішніх пытанняў і размоў узяла ў рукі сшытак з пахавальнымі песнямі і праспявала тры: *Што уныло запеваеш, На усех сонцэ свеціць, на мене уж нет, Как горко прошчатся друзья...*

Падобныя сітуацыі ўспрымаю як медыюмічны падарунак ад лёсу. І ў гэты раз пачатак сустрэчы здаўся мне як працяг нашага падарожжа па адміраючых вёсках паўз польска-беларускай мяжы...

— Мамо, лепш заспявайце штось вясёлага, — паспрабавала навесці іншы настрой дачка Алька (ахрышчаная Арыяднай), якая прыехала з места адпачыць на вёску...

— А што, гэта нядобрая песня? — здзівілася старажылка.

— Лепш *Каласілась в полі рож густая* заспявайце, — настойвала дачка. Апошняя песня, паводле яе, навейвае весялейшы настрой.

Надзея Алекша звыклася з тым, што калі каля яе хаты спыняецца машына, і калі ў хату заходзяць пастароннія людзі, у наваколлі хтось памёр і ёй прыдзецца ехаць і адпяваць пакойніка. Таму сшыткі з хаўтурнымі песнямі заўсёды пад рукой. І не дзіва што адзіныя песні, якія жывуць у яе душы і галаве — спевы па пакойніку...

* * *

Калі трыццаць гадоў таму па Сакольшчыне ў пошуках песень вандраваў рэжысёр Пятро Бароўскі, у Піражках звінелі песні жыцця. Надзея Алекша, тады сталая жанчына, праспявала сэрцашчыпальны раманс *У суботу сонечка заходзіць*. Песня канчаецца смерцю галоўнай гераіні, пакінутай сваім любым. Паслухаеш — заплачаш. Для людзей пакалення бабулі каханне — не гулі.

Той самы раманс прывёў у Піражкі і спявачку Кацярыну Дмітрук-Аляксеюк, якая адшукала твор у архівах рэжысёра-музыканта, аўтара культавага фільму „Канец песні". Я запрасілася ў кампанію і паехала з Касяй на Сакольшчыну каб паслухаць і паназіраць свет, які паводле Пятра Бароўскага адспяваў ужо сваю песню...

Праўда, той свет ведаю з асабістага досведу, але наваколле Крынак і Шудзялава гэта іншая казка. Працэс адміравання тут пачаўся намнога раней як на Падляшшы. У Піражках прывітала нас пустая вуліца і цішыня, дзесьці на панадворку самотна кукарэкаў певень. У мясцінах такіх як Піражкі ўбіваецца ў памяць кантраст паміж панадворкамі аўтахтонаў і летнікаў. Дачнікі як пад заказ адглянцавалі як шклянкі свае панадворкі ды прыздобілі экзатычнай флорай і пластмасавай фаўнай тыпу штучнага бусла. Па суседску, часта па абодвух баках сустрэнем заваленыя хаткі ў лесе крапівы і лапухоў. У такім свеце аўтахтоны, са сваім сціплым дабыткам, бачацца як той прычапі кабыле хвост. Яны звычайна корпаюцца на сваім панадворку або зачыненыя ў хаце перад тэлевізарам...

Дом Надзеі Алекшы не паддаецца такім правілам. Ён старанна адрамантаваны ад вонку і ад сярэдзіны. Панадворак прыбраны і агароджаны плотам, які змайстраваў яе 84-гадовы чалавек. Рамонт у гаспадарцы навялі добрыя зяці. Калі пераступіш парог, у вочы кідаецца тэлевізар-*плязма*, вялізны на паўпакоя. Гэта падарунак на шасцідзесяцігоддзе сямейнага сужыцця Алекшаў ад дзяцей і ўнукаў.

— А многа ў вас дзяцей? — пытаем.

— Калі мяне пытаюць пра лік дзяцей, я заўсёды кажу што добрая свіння прыводзіць дванаццаць парасят. Мы нажылі васьмёра дзетак — пяць дачок і трох сыноў. І дзевятнаццаць унукаў. Заўсёды, калі субота або нядзеля, каля хаты стаіць па чатыры-пяць *самаходы*.

Паміж песнямі мы пачуем пра рэцэпт на добрую сувязь і любоў у сямейцы:

— Заўсёды на Коледы і Вялікдзень мы даем дзецям па сто злотых. А ўнукам — на канец школьнага года. Калі хто прынясе і пакажа пасведчанне, дамо дзесяць злотых. За звычайнае. Бо калі яно з чырвонай палоскай — будзе дваццаць злотых.

* * *

Пасля хаўтурных твораў Надзея Алекша заспявала нам рускія раманасы, польскія патрыятычныя песні якія спявалі ў яе школе пасля смерці Пілсудскага, калыханкі, канапелькі, каларытныя і прыкольныя прыпеўкі ад якіх мімавольна рагочаш. Большасць песень запамятала ад сваіх маці і бабулі. Усе жанчыны ў яе сям'і спявалі ў царкоўным хоры. Яе таксама завяла маці на клірас, калі Надзея была яшчэ падлеткам. Тую сувязь трымае ўжо за семдзесят гадоў. Бо хоць Надзея Алекша нарадзілася пад Масквой (калі бацькі вярталіся з бежанства), ніколі не пакінула Піражкоў і іх царквы ў Юраўлянах. Царква збудавала яе эстэтычную прастору, навучыла як дзяліцца песняй з суседзямі і аднапляменцамі ды сагравацъ іх цяплом і красой у іх не заўсёды вясёлым свеце. Нагараваліся за жыццё. Усё было і ўсё прайшло. А цяпер, калі стала лягчэй жыць, няма людзей.

— А калі ў вашай царкве ў апошні раз быў вянец? — спыталі мы ў спявачкі.

— Дванаццаць гадоў таму.

— А хрысціны?

— Даўно, даўно...

З усяго падарожжа найбольш уразіла абрадавая вестка з Юраўлянскай парафіі. У хаце спявачкі мы пазнаёміліся з яе ўнучкай Касяй. Кася прыехала з Беластока каб адбыць стажыроўку ў Гмінай управе ў Шудзялаве. У Піражках пазнаёмілася з мясцовым хлопцам, за якога збіраецца выйсці замуж. Іх шлюб адбудзецца ў Беластоку.

— А дзе будзеце жыць?

— Вядома, у Піражках.

— Дык прычым той шлюб у Беластоку?

— Бо ў нашай царкве ўжо не вянчаюцца.

Царква ў Юраўлянах

ISSN 0546-1960